КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 5 (326) ◂ 8 лютага ◂ 2013 г.
www.novychas.org

# Новы Час



**СВАЁЮ ПУЦЯВІНАЙ**

Стар. 15

**«СТРАТЭГІЯ АПЯРЭДЖАННЯ» ЗАМЕСТ «САБАКІ НА СЕНЕ»**

Пачалося адкрытае грамадскае абмеркаванне праекта Нацыянальнай платформы бізнэсу Беларусі–2013. Асобныя яе моманты каментуе віцэ-старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў Канстанцін Каламіец

Стар. 5

**КАТАЛОНСКАЯ ІМПЕРЫЯ**

Нават магчымае абвяшчэнне незалежнасці Каталоніі не здыме каталонскае пытанне з павесткі дня, паколькі каталонцы маюць сур'ёзныя тэрытарыяльныя прэтэнзіі да краін-суседак

Стар. 11

**ЗБАЎЛЕННЕ АД БЕЛАРУСКАСЦІ**

Стар. 14

ISSN 2218-2144

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**МАСТАК БРАНІСЛАЎ ЯМАНТ**

Нарыс Сяргея Гваздзёва

▸ **АД РЭДАКТАРА**

# ПРЫВІТАННЕ, ВАЛЮТНЫ КРЫЗІС!

*Сяргей ПУЛЬША*

**У пагоні «за мадэрнізацыяй» беларускія фінансавыя колы прымаюць дзіўныя рашэнні, якія ў хуткім часе могуць вярнуць у краіну стан 2011 года — валютны крызіс і дэвальвацыю.**




Менавіта так спецыялісты расцэньваюць тое, што з 1 лютага Нацбанк часткова адмяніў уведзенае ў канцы лістапада 2012 года абмежаванне на прадстаўленне валютных крэдытаў юрыдычным асобам — рэзідэнтам Беларусі. Зараз валютныя крэдыты на тэрмін звыш года беларускія банкі змогуць выдаць без якіх-небудзь абмежаванняў. А абмежаванне распаўсюджваецца толькі на кароткатэрміновыя крэдыты.

Нагадаем, што ранейшае рашэнне Нацбанка па абмежаванні валютнага крэдытавання было пазітыўна ўспрынятае адмыслоўцамі. Сутнасць абмежавання заключалася ў тым, каб прадпрыемства афармляла валютны крэдыт у беларускім банку толькі пры наяўнасці разліковых дакументаў: плацежнага даручэння альбо патрабавання, акрэдытыву і гэтак далей. Дэ-факта прадпрыемства не атрымлівала гэты крэдыт — сума замест залічэння на рахунак суб'екта гаспадарання пералічвалася банкам па рэквізітах, названых у разліковых дакументах, замежнаму пастаўшчыку тавараў або паслуг.

Зараз краіна вярнулася да ранейшай крэдытнай палітыкі. Чым гэта пагражае? Найперш тым, што гэта «развяжа рукі нядобрасумленным прадпрыемствам», лічыць эканаміст Антон Болтачка. Зараз прадпрыемствы пад відам «мадэрнізацыі» пачнуць браць валютныя крэдыты. Але з-за таго, што стаўка па крэдыту ў валюце значна меншая за стаўку па крэдыту ў беларускіх рублях, грошы можна зрабіць «з паветра» — перавесці валюту ў беларускія рублі, пакласці гэтыя беларускія рублі ў банк пад вышэйшыя працэнты і ні пра што не клапаціцца.

Зразумела, валюту будзе скупаць і Нацбанк, тым самым укінуўшы дадатковыя «надрукаваныя» беларускія грошы на рынак. У сваю чаргу, гэта прывядзе да рэзкага падзення працэнтных ставак па рублёвых укладах, у выніку чаго насельніцтва будзе забіраць уклады з банкаў і на гэтыя грошы скупляць больш надзейную валюту. Вынік вядомы — нястача валюты, як у 2011 годзе, інфляцыя і, магчыма, новая дэвальвацыя беларускага рубля.

Але не толькі ў гэтым Антон Болтачка бачыць пагрозу новага рашэння Нацбанка. Па ягоных словах, дазволам на валютнае крэдытаванне Нацбанк увагнаў сябе ў «вілку» паміж «яшчэ горшым і зусім дрэнным» шляхам развіцця падзей.

Ёсць варыянт, паводле Болтачкі, калі крэдыты сапраўды пойдуць «на мадэрнізацыю», — то бок, прадпрыемствы, якія атрымалі валютны крэдыт, сапраўды закупяць на яго неабходнае абсталяванне за мяжой. Але ж прадукцыю, якую вырабяць на сваім прадпрыемстве, яны будуць прадаваць тут, у Беларусі. У выніку, каб аддаць крэдыт, прадпрыемства звернецца да валютнага рынку, і пачнецца скупка валюты, што таксама прывядзе да дэфіцыту валюты. Тут ужо Нацбанку трэба будзе праводзіць валютныя інтэрвенцыі, каб забяспечыць попыт на валюту, што прывядзе да скарачэння золатавалютных рэзерваў. Гэта не дэвальвацыя, але таксама непрыемна.

Куды ні кінь — паўсюль клін. Для чаго ж Нацбанк гэта зрабіў?

Эканамісту здаецца, што такое рашэнне было прынятае ў барацьбе паміж дзвюма групоўкамі ва ўладзе: «мадэрнізацыйнай», на чале з кіраўніком урада Міхаілам Мясніковічам, якая зараз, з прыходам «наглядальніка за мадэрнізацыяй» Пятра Пракаповіча, стала больш моцнай, і «эканамічна-фінансавай» на чале са старшынёй Нацбанка Надзеяй Ермаковай. Пакуль што выйграў «мадэрнізацыйны» клан з ягоным дэвізам «мадэрнізацыя любым коштам».

Але іншы эканаміст, Сяргей Балыкін, лічыць, што не ўсё так кепска, як магло б быць. Ён адразу ж задаўся пытаннем: а хто гэтыя валютныя крэдыты будзе выдаваць? Калі гэта крэдытаванне будуць ажыццяўляць камерцыйныя банкі па камерцыйных стаўках крэдыту, то прадпрыемствы пяць разоў падумаюць, браць такі крэдыт або не.

Праблема палягае ў тым, што валютны крэдыт «каштуе» значна меней, чым рублёвы. З-за гэтага валюту пераводзілі ў беларускія рублі і «жылі на працэнты». Калі зараз валютныя крэдыты не будуць ільготнымі, то шанец на тое, што іх перавядуць у рублі, будуць мінімальныя. Бо калі з рублямі праблемаў амаль няма, то набыць валюту, каб разлічыцца за крэдыт, усё ж такі больш складана.

Сённяшнія стаўкі па рублёвых укладах знаходзяцца на высокім ўзроўні — каля 60% за год. У той жа час валютная стаўка — 7%. Варта толькі ліквідаваць такі разрыў — і схема атрымання грошай з паветра, толькі на банкаўскіх працэнтах, перастане існаваць.

Яшчэ Нацбанк можа адказаць «мадэрнізацыяністам» тым, што абмяжуе прапановы па продажу беларускага рубля. То бок, не стане скупаць валюту незабяспечанымі грашыма і не будзе ўключаць станок для друкавання грошай. «Трэба абмежаваць прапанову беларускага рубля і не накачваць эканоміку «дутымі» грашыма. Тады Нацбанк здолее стрымаць стабільны курс беларускага рубля», — упэўнены Балыкін.

Карацей, у Нацбанка ёсць яшчэ шанец для манеўру. Але ці здолее ён ім скарыстацца? Наперадзе пасяўная, калі традыцыйна грошы «закопваюцца» ў сельскую гаспадарку. Ад таго, колькі грошай укінуць у эканоміку ў гэты перыяд, будзе залежыць, наколькі нам спатрэбіцца новая дэвальвацыя.

СУД

# ІСК МІЛАНЫ ХАРЫТОНАВАЙ

**У судзе Маскоўскага раёна Брэста ідзе разгляд справы па іску сябры ГА «БАЖ» Міланы Харытонавай у дачыненні да карэспандэнта дзяржаўнай газеты «Брестский вестник» Уладзіміра Міневіча.**

Нагадаем, што Харытонава спрабуе абараніць сваe гонар, годнасць і дзелавую рэпутацыю пасля таго, як на адным з гарадскіх інтэрнэт-парталаў Брэста летась былі змешчаныя абразлівыя ў дачыненні да яе выказванні ананімнага аўтара. Незалежная фотажурналістка падала ў міліцыю заяву з просьбай знайсці і пакараць асобу, якая пакідала допісы. Высветлілася, што іх аўтарам быў Уладзімір Міневіч, які працуе ў газеце «Брестский вестник», заснаванай мясцовым гарвыканкамам. Акрамя абвяржэнняў, зробленых у каментарах высноваў, Мілана Харытонава патрабуе ад карэспандэнта дзяржаўнай газеты 3 мільёны рублёў у якасці кампенсацыі нанесенай маральнай шкоды.

Падчас чарговага судовага пасяджэння абодва бакі заявілі пра хадайніцтва, каб была прызначана экспертыза тэксту, што з'яўляецца прадметам разгляду.

Розніца палягае ў тым, што Мілана Харытонава прапануе даручыць лінгвістычную экспертызу дасведчанай і незалежнай асобе, якая мае адпаведную ліцэнзію. У той жа час адказчык Уладзімір Міневіч жадае, каб экспертыза была праведзена спецыялістамі філалагічнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Да гэтага пытання суд вярнуўся на ступным пасяджэнні.

Як адзначыла Мілана Харытонава, існуюць істотныя разыходжанні наконт мэты экспертызы. «Мы разам з адвакатам жадаем, каб эксперт глядзеў, у якім кантэксце былі выкарыстаны абразлівыя допісы на мой адрас, а адказчык хоча, каб аналізаваліся нават не цэлыя каментары, а толькі ўрыўкі з іх», — распавяла сябра БАЖ.

**Паводле інфармацыі БАЖ і spring.org**

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# «МЛЫН МОДЫ» НА ЛАВЕ ПАДСУДНЫХ

**Вольга ХВОІН**

**Пачаўся судовы працэс над вядомым беларускім мадэльерам Аляксандрам Варламавым.**

Яму інкрымінуюць злоўжыванне службовымі паўнамоцтвамі, крадзеж грошай у буйным памеры. Дзяржабвінаваўца паведаміў, што практычна па ўсіх злачынствах, якія ставяцца Варламаву ў віну, прадугледжана да 10 гадоў пазбаўлення волі.

Па справе праходзіць 346 пацярпелых. Судовыя слуханні адбываюцца ў адкрытым рэжыме. Аляксандр Варламаў сваёй віны не прызнае. «Сказаць, што гэта адна лухта, я не магу, таму скажу, гэта хлусня», — заявіў ён у судзе наконт прад'яўленых абвінавачванняў.

Варламава абвінавачваюць у злоўжыванні службовым становішчам, а менавіта выкарыстанні службовых памяшканняў (ліцэя БДУ) для платных заняткаў Агенцтва моды Сашы Варламава; у выкарыстанні сродкаў, выдзеленых на рэкламу «Млына моды», для рэкламы свайго Агенцтва моды Сашы Варламава; выкарыстанні сутачных камандзіраваных (за мяжу ў рамках «Млына моды») на асабістыя патрэбы, таксама прад'яўлена абвінавачванне ў крадзяжы грошай, што выдзяляліся на заработную плату супрацоўнікаў Цэнтра маладзёжнай моды БДУ; прысваенні ўсіх сутачных, якія павінны былі быць вылучаныя дэлегатам; крадзяжы сродкаў бацькоў, якія плацілі за свой удзел у паездках (каб быць побач з дзецьмі), падробцы квітанцый. Агулам, па версіі следства, Варлама скраў больш як 1,2 мільярда рублёў.

Судовы працэс над Варламавым мае рэзананс: абмяркоўваюць сэксуальную арыентацыю мадэльера, кватэру, у якой ён жыве, стаўленне да мадэляў, антураж, у якім адбываецца суд. Апошні момант выклікае ў многіх як мінімум неразуменне. Варламаў мае 2-ю групу інваліднасці, ужо знаходзячыся пад следствам у СІЗА ён перанёс чацвёртую аперацыю на храбце. У судзе Варламаў знаходзіцца ў клетцы, прыходзіць з мыліцамі, увесь час мяняе позы, бо відавочна яму баліць.

Між іншым, адной з верагодных прычынаў для «наезду» на Варламава называюць з'яўленне канкурэнтнага «Млыну моды» праекта — «Belorussian fashion week» пад кіраўніцтвам маладой і амбіцыйнай дзяўчыны Яніны Ганчаровай. Даўняя сяброўка і калега Варламава Людміла Лабкова напрыканцы 2011 года ў часе паказу сваёй калекцыі на BFW заявіла, што прысвячае сваю працу Варламаву (мадэльер тады ўжо знаходзіўся ў СІЗА пад следствам). «BFW — гэта адзіны момант, які дазваляў гучна выказаць сваё меркаванне на гэты конт. Я лічу, што Саша варты таго, каб яму прысвяціць калекцыю. Я вельмі паважаю гэтага чалавека. Добра ведаю ўсю сістэму «Млына моды». Адпрацаваўшы ў ёй больш за 7 гадоў, магу сказаць, што лічу сённяшнюю сітуацыю вельмі несправядлівай», — заявіла тады Людміла Лабкова.

Цікава, што за ўвесь час, пакуль Аляксандр Варламаў быў у СІЗА, больш ніхто з беларускіх мадэльераў не выказаў яму публічна сваю падтрымку ці салідарнасць.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# ЗАПЫТ ПЕРАДАДЗЕНЫ

**Некалькі тыдняў таму Марэк Мігальскі адправіў запыт у Міністэрства замежных спраў Беларусі наконт магчымасці наведвання Міколы Стакевіча і Змітра Дашкевіча для праверкі ўмоў іх утрымання.**

Запыт Мігальскага ў справе магчымасці наведвання дэлегацыяй Еўрапарламента па справах Беларусі палітвязняў Мікалая Статкевіча і Змітра Дашкевіча ўжо трапіў у Міністэрства замежных спраў Беларусі і перададзены ў кампетэнтныя органы. Пра гэта Радыё «Рацыя» паведаміў прэс-сакратар ведамства Андрэй Савіных:

— Мы перадалі гэты запыт у кампетэнтныя органы, адказ будуць даваць яны.

— *У якія органы? — спытаў карэспандэнт гэта Радыё «Рацыя».*

— У кампетэнтныя. Гэта вельмі кампетэнтныя.

— *Калі можна чакаць адказу?*

— Калі яны палічаць патрэбным адказаць.

Еўрадэпутат Марэк Мігальскі ініцыяваў акцыю салідарнасці з беларускімі палітвязнямі «Свабода х 2» — кандыдатам на пасаду прэзідэнта Міколам Статкевічам і лідарам Маладога Фронту Змітром Дашкевічам.

**Паводле інфармацыі Радыё «Рацыя»**

КРУГЛЫ СТОЛ

# АНДРЭЙ ГАЙДУКОЎ — ПАЛІТВЯЗЕНЬ

**Сяргей ПУЛЬША**

**Дэмакратычная грамадскасць вызнае Андрэя Гайдукова палітвязнем.**

Такое рашэнне прынялі прадстаўнікі грамадскасці падчас круглага стала, прысвечанага «шпіёнскай справе» Гайдукова ў Мінску 7 лютага.

Нагадаем, намеснік старшыні «Саюза маладых інтэлектуалаў» А. Гайдукоў быў затрыманы ў Віцебску 8 лістапада. У дачыненні да яго распачата справа па ч.1 арт. 356 КК (здрада дзяржаве ў форме правядзення агентурнай дзейнасці).

Гайдукоў займаўся рэгістрацыяй «Саюза маладых інтэлектуалаў», падчас прэзідэнцкіх выбараў 2010 года працаваў у камандзе кандыдата ў прэзідэнты Андрэя Саннікава.

Як сказала каардынатар праваабарончай групы «За волю» Ганна Шапуцька, неабходнасць такога рашэння палягала ў тым, што большасць праваабарончых арганізацый прызнаюць людзей «вязнямі сумлення» толькі пасля таго, як над імі адбудзецца суд. «Тым часам, справа Гайдукова — выключна палітычная. Яго неаднаразова папярэджвалі, каб ён спыніў сваю грамадскую актыўнасць, пагражаючы «непрыемнасцямі» аж да арышту. Гэты арышт і адбыўся», — кажа Шапуцька.

На карысць палітычнай матываванасці справы сведчыць і тое, што Гайдукоў знаходзіцца пад вартай КДБ ужо тры месяцы. Але раней паведамлялася, што ён быў схоплены «на месцы злачынства», — у момант закладкі нейкага тайніка з інфармацыяй. Тое, што тры месяцы без асаблівых вынікаў цягнецца следства, азначае, што справа Гайдукова «высмактаная з пальца», лічыць Шапуцька.

Па словах каардынатаркі аргкамітэту па стварэнні БХД з Віцебску Таццяны Севярынец, міжнародныя арганізацыі «проста не могуць зразумець, што такое справа Гайдукова». «Бо абсурднасць прад'яўленага абвінавачвання ім не зразумелая. Таму мы павінны растлумачыць ім, у чым падазраецца Гайдукоў, і растлумачыць гэты абсурд», — адзначыла Севярынец.

ЖКГ

# ДЭПУТАТ ДАМОГСЯ КАПРАМОНТУ

**Народны дэпутат з Мастоў Зміцер Краснапеўцаў атрымаў адказ ад мясцовых камунальшчыкаў на калектыўны зварот грамадзян.**

Жыхары шматпавярховага дома № 5 па вул. Цэткін скардзіліся на адсутнасць капітальнага рамонту дома, які быў пабудаваны яшчэ ў 1970-х гадах.

Паводле адказу, зараз вядуцца працы па капітальным рамонце шматпавярховага дома. Камунальшчыкі выканаюць працы па замене інжынерных сетак дома, рамонце пад'ездаў, уваходаў у пад'езды, рамонце пліт гаўбцоў і замене агароджаў на металапрофіль. Камунальшчыкі плануюць завершыць азначаныя працы да канца другога квартала 2013 года.

Зміцер Краснапеўцаў балатаваўся ў Мастоўскі раённы Савет дэпутатаў у 2010 годзе. Пасля выбараў ён далучыўся да ініцыятывы БХД Рады народных дэпутатаў, актывісты якой прагнуць адстойваць інтарэсы сваіх выбарцаў.

У той час ні аднаго з дэпутатаў мясцовых саветаў праблема капрамонту шматпавярховікаў у Мастах не зацікавіла. Вырашэннем праблем ЖКГ займаюцца толькі народныя дэпутаты.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БХД**

ПРАПАНОВА

# ПАСТАВІЦЬ У МІНСКУ ПОМНІК КАЛІНОЎСКАМУ

**Сяргей ПУЛЬША**

**Актыўная беларуская моладзь незадаволеная і тым, што ўлады як след не ўшаноўваюць 150-годдзе паўстання Кастуся Каліноўскага, і тым, як гэтую дату святкуе дэмакратычная грамадскасць.**

Пра гэта на прэс-канферэнцыі разважаў лідар аргкамітэту па стварэнні маладзёжнай арганізацыі «Альтэрнатыва» Алег Корбан.

Хіба «дэмакратычнага святкавання», на ягоную думку, палягае ў тым, што дэмсілы засяроздзіліся на ўшанаванні месцаў пахавання паўстанцаў і правядзенні «круглых сталоў». Моладзь жа прагне больш актыўных дзеянняў. Таму «Альтэрнатыва» прапануе занята справай — пачаць збор подпісаў сярод жыхароў Мінска за ўсталяванне ў сталіцы помніка Кастусю Каліноўскаму і паўстанцам.

«Гэта яшчэ больш актуальна на фоне так званых «гігіенскіх канферэнцый», на якіх нейкія незразумелыя гісторыкі, абмяркоўваючы падзеі 150-гадовай даўніны, сцвярджаюць, што гэтае паўстанне было не беларускім, беларусы ад яго нічога не выйгралі, і на карысць краіны гэта не пайшло. Такім чынам, збор подпісаў мае і яшчэ адну мэту — расказаць людзям пра тыя гераічныя часы і пра тое, што тады адбывалася насамрэч», — кажа Корбан.

За чатыры месяцы маладзёны плануюць сабраць 10 000 подпісаў за ўсталяванне такога помніка. «Мы не архітэктары і не горадазнаўцы, таму месца помніка мы не вызначаем, ягоную вывяу — так сама. Пасля таго, як рашэнне аб усталяванні помніка будзе прынятае, хай гэта робяць адмыслоўцы», — сказаў Корбан, адзначыўшы пры гэтым, што помнік «пажадана паставіць» у цэнтры горада.

Адной «Альтэрнатывы» для збору такой колькасці подпісаў будзе мала, хоць, па словах Корбана, у іх ёсць недзе паўтара дзясяткі «прафесійных» зборшчыкаў подпісаў, якія добра сябе зарэкамендавалі падчас прэзідэнцкай кампаніі. Таму Корбан заклікаў далучыцца да ініцыятывы і такія арганізацыі, як «Гавары праўду!», «Наш дом» і іншыя.

Грошай за такія подпісы не заплацяць. Але магчымыя іншыя формы заахвочвання моладзі. Найлепшым зборшчыкам подпісаў «Альтэрнатыва» абяцае вандроўкі па месцах паўстання, прычым не толькі ў Беларусі, але ў Польшчы і Літве.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ПАСТКІ ГОДА БЕРАЖЛІВАСЦІ

Сяргей САЛАЎЁЎ



**Год беражлівасці, абвешчаны Лукашэнкам, гледзячы па ўсім, будзе больш выніковы, чым ранейшыя гады кнігі альбо здароўя ці невядома чаго яшчэ. Таму што беражлівасць — гэта не здароўе ці кніга, гэта нешта матэрыяльнае, тое, што можна памацаць альбо адчуць у сваіх кішэнях. Альбо не адчуць — гэта як каму пашанцуе.**

Здаецца, і чыноўнікі, і сам спадар Лукашэнка- ліхаманкава пачалі пошукі: што б такога зберагчы? Як высвятляецца, зберагчы ёсць што. Адно толькі, што наўрад ці будуць гэтаму рады людзі.

Прыкладам, газ. Пра беражлівасць гэтага хоць і не цвёрдага, але вельмі карыснага выкапня, казалі ўжо нямала. Але чаму ж людзі плацяць толькі за сам газ? Бо, набываючы квіток на аўтобус, яны ж плацяць не толькі за паліва, але і за сам аўтобус, падумалі недзе. У выніку прынялі ўказ, які ўнёс змены ў парадак фінансавання расходаў па газіфікацыі жылых дамоў грамадзян. Раней праектаванне і будаўніцтва газаправодаў эксплуатаванага жыллёвага фонду ажыццяўлялася таксама за кошт грамадзян, але 2% выдаткаў пакрывалася са сродкаў інавацыйнага фонду, створанага Міністэрствам энергетыкі. Зараз усе выдаткі па праектаванні, урэзцы ў газаправод і пракладцы газавых камунікацый унутры дома будуць несці выключна ўладальнікі нерухомасці.

Вось хоць 2 працэнты, але зэканомілі. Малайцы, беражлівыя!

Але ж грошы аднекуль узяць трэба. Таму дзяржава будзе прадаваць прадпрыемствы — цалкам і часткова. Цалкам прадаецца, напрыклад, бровар Яўстафія Любанскага ў Лошыцкім парку. Але з яго інвестар павінен зрабіць чатырохзоркавы гатэль, і пры гэтым захаваць яго як помнік архітэктуры, прадпрыемства ёсць увага некалькіх інвестараў, як айчынных, так і замежных», — сказаў Забела, адзначыўшы, што сродкі інвестара ад продажу пакета акцый будуць накіраваны на пагашэнне інвестыцыйных крэдытаў «Крыніцы».

Не ведаю, хто тыя замежныя інвестары, якія зацікавіліся акцыямі «Крыніцы», але тое, што яны «лохі», гэта дакладна. Па-першае, хто ж будзе «інвеставаць» у тое, каб «Крыніца» проста аддала іх грошы крэдыторам? А па-другое, усе яшчэ памятаюць, як «кінулі» іншага інвестара — «Балтыку», якая правяла мадэрнізацыю прадпрыемства, а потым была проста выкінутая з заводу.

Грошы можна адабраць і іншы чынам. Як казалі героі «Прастаквашына», спачатку набыць што-небудзь непатрэбнае, а потым прадаць што-небудзь непатрэбнае. Толькі там жывёлы мелі на ўвазе нешта матэрыяльнае, але ж мы не думаем такімі вузкімі катэгорыямі. Прэзідэнт днямі падпісаў і яшчэ адзін указ, у мэтах «актывізацыі працэсаў асваення і ўкаранення ў вытворчасць вынікаў навуковых даследаванняў і распрацовак».

Адпаведна, у Беларусі зараз уводзіцца патрабаванне да дзяржаўнага заказчыка забяспечыць камерцыялізацыю вынікаў навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці (НТД) на працягу трох гадоў пасля іх стварэння. Дакументам прадугледжана, што заказчык, не які здолеў на працягу года самастойна камерцыялізаваць

## Яшчэ не сціх скандал з наваполацкімі водаканальшчыкамі, якія размясцілі заяву на тэндэр па закупцы аўтамабіля, як віцебскія газавікі таксама захацелі сабе аўто

горадабудаўніцтва і гісторыка-культурную каштоўнасць. Канешне, каб памяшканне выкарыстоўвалася па прызначэнні, для варкі піва, гэта было б зрабіць лягчэй, а чатырохзоркавы гатэль у, фактычна, прамысловым памяшканні? Гэта, здаецца, нонсэнс.

Прадаецца таксама і частка іншага бровара, які перарабляць ні ў што не трэба. Ашчадненька так прадаецца. Пакет акцый ААТ «Крыніца» ў памеры 25% будзе прададзены на конкурсе, заявіў на прэс-канферэнцыі ў аўторак у Мінску старшыня канцэрна «Белдзяржхарчпрам» Аляксандр Забела.

«Мы прынялі рашэнне аб продажы пакета акцый «Крыніцы», да вынікі НТД, абавязаны перадаць правы на іх зацікаўленаму рэзідэнту РБ. Пры гэтым перадача маёмасных правоў на вынікі НТД магчымая любой арганізацыі незалежна ад формы ўласнасці, здольнай забяспечыць эфектыўнае ўкараненне вынікаў НТД у вытворчасць на працягу года пасля набыцця правоў на іх (тэрмін можа быць прадоўжаны да трох гадоў па рашэнні заказчыка).

То бок, калі Рэнтген вынайшаў свае «ікс-прамяні», яму адразу было патрэбна стварыць апарат імя сябе, любімага, і прыдумаць, як яго скарыстаць. А калі б ён гэтага не зрабіў на працягу года, то ніякага рэнтгену ў нас увогуле не было б. Было б нешта іншае, з зусім іншым імем.

Але мала знайсці грошы, трэба яшчэ іх і скарыстаць нармальна. А з гэтым у нас — вялікія праблемы.

Не паспеў яшчэ сціхнуць скандал з наваполацкімі водаканальшчыкамі, якія размясцілі заяву на тэндэр па закупцы аўтамабіля з падагрэвам сідушак за 37 000 долараў, як віцебскія газавікі таксама захацелі сабе аўто — Toyota Hilux за 41 000 долараў. Мяркуючы па заяўленым кошце, пікап набываецца ў камплектацыі Comfort, куды, у адрозненне ад базавай, уваходзяць таніраванае шкло, храмаваныя бакавыя люстэркі, лёгкасплаўныя дыскі, аўдыёсістэма з 6,1-дзюймавым дысплеем і шасцю дынамікамі, а таксама шэраг іншых паляпшэнняў.

Ну навошта ім таніраванне шкла? Каб любы ДАІшнік штрафы мог зарабіць? Навошта газавікам аўдыёсістэма? Ім песня будаваць і жыць дапамагае?

Але ўсіх пераплюнулі гродзенцы. Гродзенскі аблвыканкам на сайце дзяржзакупак размясціў тэндэр на набыццё чатырох тэлевізараў агульным коштам 35 мільёнаў рублёў. У пераліку на долары — па 1 000 «баксаў» за штуку. Як адзначае газета «Наша ніва», у крамах за гэты кошт можна набыць самы сучасны «Самсунг» альбо «Соні» з дыяганаллю 40 дзюймаў. А аналагічны беларускі «Гарызонт» каштуе 400 долараў. На самім прадпрыемстве гавораць, што самы дарагі беларускі тэлевізар у іх каштуе каля 800 долараў.

Акрамя тэлевізара, гродзенскі аблвыканкам сёлета плануе набыць 10 ноўтбукаў па 10 мільёнаў за штуку (каля 1 150 долараў). Кошты на «бюджэтныя» мадэлі ноўтбукаў пачынаюцца ад 400 долараў, за 550 можна набыць нармальную машыну для працы. А ноўт за «штуку» — гэта ўжо «круцізна».

Але ж мы ведаем, для чаго гэта робіцца. Усё для таго, каб потым «прадаць што-небудзь непатрэбнае». Вось прададуць гэтыя тэлевізары і ноўтбукі, і павысіцца абаротнасць абаротных сродкаў, што ўжо можна запісаць сабе ў плюс. І, што яшчэ больш важна, можна даць справаздачу пра зберагання валюты. Інакш бы чыноўнікі напросту паехалі б за такой жа тэхнікай, але значна таннейшай, у суседнюю Польшчу. Гэтак робіць усё Гродна, і без усялякіх тэндэраў.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ



### АЛЯКСАНДР ШАМКО

Міністр спорту Аляксандр Шамко прапануе ўмацаваць ідэалагічную працу сярод спартоўцаў. «Ідэалагічная праца з'яўляецца эфектыўным сродкам згуртавання сіл для дасягнення пастаўленай мэты», — сказаў Шамко на пасяджэнні калегіі міністэрства. Паводле яго слоў, тут патрабуюцца не толькі веды, але і «пэўны ўзровень асабістай культуры». Шамко паскардзіўся на тое, што праца ў гэтай сферы вядзецца фармальна і ад выпадку да выпадку, а некаторыя выказванні «нашых выхаванцаў» «злёту падхопліваюць так званыя нашы свядомыя». Відавочна, міністр згадаў алімпійскую чэмпіёнку, плыўчыху Аляксандру Герасіменю, якая заявіла, што з пункту гледзішча эстэтыкі белчырвона-белы сцяг ёй больш сімпатычны за чырвона-зялёны.

Раскрытыкаваў міністр і нерэалізаваны патэнцыял беларускіх спартоўцаў. Ён адзначыў, што толькі 38% спартсменаў, якія прэтэндавалі на алімпійскія медалі ў Лондане ў 2012 годзе, змаглі рэалізаваць свой патэнцыял. Ён заявіў, што лонданская Алімпіяда стала «асноўным іспытам» для спартыўнай галіны ў 2012 годзе. Ён назваў вынікі выступлення нездавальняючымі: за ўсю гісторыю выступлення беларускіх атлетаў самастойнай камандай было заваявана мінімум медалёў. «Алімпійскія гульні паказалі нашы слабыя месцы», — цытуе Аляксандра Шамко БелаПАН.

Аляксандр Шамко ўзначаліў Мінспорту 31 кастрычніка 2012 года. Раней ён займаў пасаду намесніка міністра па надзвычайных сітуацыях.

### АЛЯКСАНДР ХАРКАВЕЦ



Міністр фінансаў Андрэй Харкавец у інтэрв'ю часопісу «Фінансы, улік, аўдыт» падвёў фінансавыя вынікі 2012 года. Паводле слоў чыноўніка, рэспубліканскі бюджэт склаўся з дэфіцытам каля 0,5 трыльёна рублёў. Харкавец патлумачыў, што на прыбытковую частку бюджэту паўплывала зніжэнне паступленняў ад экспарту ў сувязі са скарачэннем знешняга попыту на калійныя ўгнаенні. Акрамя таго, рост экспарту тавараў прывёў да павелічэння вяртання ПДВ экспарцёрам, а ўмацаванне курсу беларускага рубля ў параўнанні з прынятым пры фарміраванні бюджэту не дазволіла атрымаць запланаваныя даходы ад знешнеэканамічнай дзейнасці.

«Яшчэ адна прычына — змяншэнне аб'ёмаў імпарту тавараў у Расійскую Федэрацыю ў параўнанні з прагнозам прывяло да зніжэння аб'ёму ўвазных мытных пошлін, якія пералічваюцца з Расіі ў беларускі бюджэт у адпаведнасці з пагадненнем аб устанаўленні і прымяненні ў Мытным саюзе парадку залічэння і размеркавання ўвазных мытных пошлін», — растлумачыў кіраўнік Мінфіна.

Паводле яго слоў, на паступленні даходных крыніц бюджэту таксама аказала ўплыў «запаволенне эканамічнай актыўнасці арганізацый краіны ў сілу ўплыву фактараў стабілізацыйнай макраэканамічнай палітыкі, якая цяпер рэалізуецца». Часткова страты былі кампенсаваныя дадатковымі паступленнямі падатку на прыбытак, павелічэннем ставак акцызаў, увядзеннем спецыяльнага збору на экспарт калійных угнаенняў, дадатковымі даходамі мэтавых бюджэтных фондаў.

### АНАТОЛЬ РУБІНАЎ



Прымяненне смяротнага пакарання ў дачыненні да забойцаў апраўдана. Такое меркаванне ў інтэрв'ю БелТА выказаў старшыня Савета Рэспублікі Анатоль Рубінаў. «Многія беды ад таго, што мы ляльна ставімся да парушальнікаў і злачынцаў. Да іх трэба ўжываць жорсткія, адэкватныя меры. Гэта будзе гуманна да ўсіх астатніх, дазволіць засцерагчы добрапрыстойных грамадзян, забяспечыць ім бяспечныя ўмовы жыцця», — сказаў Анатоль Рубінаў. Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліў, што, на яго погляд, прымяненне смяротнага пакарання ў дачыненні да забойцаў апраўдана. «Гэта не помста, як трактуюць некаторыя. Гэта вымушаная ўстаноўка, што людзям, якія наўмысна здзейснілі забойства, няма месца ў грамадстве. Не трэба іх перавыхоўваць — такіх не перавыхаваеш. Месцам, раўназначным маральнаму катаванню, у дадзеным выпадку з'яўляецца пажыццёвае зняволенне», — адзначыў Анатоль Рубінаў.

Напрыканцы мінулага года ў Нацыянальным сходзе стварылі групу па вывучэнні праблемы смяротнага пакарання. У склад групы ўвайшлі сем чалавек: пяць дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і два з верхняй палаты Савета Рэспублікі. Беларусь застаецца адзінай краінай у Еўропе, дзе выносяцца і выконваюцца смяротныя прысуды.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# ПРА ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА І ХІЛЕЛЯ ВАВІЛОНЦА

Сяргей НІКАЛЮК

**Партыйным кіраўнікам, перш чым спрабаваць мабілізаваць грамадства, варта было б авалодаць мастацтвам мабілізацыі партыйных сяброў.**




У папярэдняй азбуцы паліталогіі (гл. «Данос як форма палітычнай дзейнасці») мы разважалі пра беларускае грамадства. Нягледзячы на папулярную ў апазіцыйным асяродку думку, здольнасць грамадства засвойваць палітычную інфармацыю абмежаваная.

Звернемся да снежаньскага апытання НІСЭПД. Здавалася б, дзяржаўныя і незалежныя СМІ не пакрыўдзілі сваёй увагай тэму ліквідацыі назіральных саветаў на «Камунарцы» і «Спартаку». Аднак толькі 47% рэспандэнтаў пра такую неардынарную навіну на беларускіх мерках падзею «штосьці чулі». Між іншым, штодня глядзіць тэлевізар 61% суайчыннікаў, яшчэ 18% аддаюцца гэтаму шаноўнаму занятку 4–6 дзён на тыдзень, колькасць жа карыстальнікаў інтэрнэту перавысіла 60%!

Грамадзяне адрозніваюцца паводле ўзроўню ўвагі да палітыкі. Пераважная большасць так званых «простых людзей» жыве праблемамі бліжэйшага асяроддзя (сям'я, праца) і не цікавіцца падзеямі, што адбываюцца па-за яго межамі. Асабістае жыццё так званых эстрадных «зорак» — адно з нешматлікіх выключэнняў, бо так прыемна ўсведамляць, што паводзіны «зорак» на побытавым узроўні практычна нічым не адрозніваюцца ад паводзін суседзяў па лесвічнай пляцоўцы!

На ўспрыманне/неўспрыманне палітызаванай інфармацыі ўплываюць таксама і палітычныя схільнасці грамадзян. Зразумела, што ў пенсіянераў, чыё выжыванне ў сучасных умовах залежыць ад дзяржаўнай падтрымкі, і ў эканамічна актыўных беларусаў яны не супадаюць.

Два прыклады. У маі 1995 года, калі я быў памочнікам кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага савета ад Народнага фронту, на сабе адчуў уплыў фільма «Нянавісць: дзеці хлусні» на прыхільнікаў АП (адзінага палітыка). На наступны дзень пасля паказу па тэлебачанні «шэдэўра» Азаронка бабулькі зачынялі перада мной дзверы з крыкам: «Ідзі адсюль, фашыст!»

А зараз перанясёмся праз Атлантычны акіян. У 1998 годзе рэспубліканцы паспрабавалі арганізаваць імпічмент прэзідэнту-дэмакрату Білу Клінтану ў сувязі з яго інтрыжкай з Монікай Левінскі. Скончылася ўсё гэта сумна для… рэспубліканцаў. Яны страцілі месцы ў Кангрэсе.

Каб растлумачыць парадокс, прывяду цытату з артыкула амерыканскага паліталага Мэрыян Джаст «Стварэнне вобразу лідарства: на прыкладзе Клінтана і Уотэргейта» (нагадаем, што за спробу рэспубліканцаў усталяваць праслухоўванне ў штабе дэмакратычнай партыі ў гатэлі «Уотэргейт» прэзідэнт Рычард Ніксан быў вымушаны пайсці ў адстаўку). «Да ключавых фактараў стварэння вобразу лідара варта аднесці ранейшыя чаканні і палітычныя дасягненні, якія прыпісваюцца лідару».

Монікагейту папярэднічалі 6 паспяховых у эканамічным плане гадоў прэзідэнцтва Клінтана. На гэтым і грунтаваліся «ранейшыя чаканні» амерыканцаў. Спробу адхілення «нашага Біла» ад улады яны ўспрынялі як пагрозу ўласнай бяспецы, і гэта пераважыла іх прыроднае пурытанства.

У 1995 годзе АП быў на піку сваёй папулярнасці. Дасягненнямі (запускам заводаў) ён яшчэ не паспеў адзначыцца, але ўзровень грамадскіх чаканняў пасля яго трыўмфальнай перамогі на першых прэзідэнцкіх выбарах быў надзвычай высокі. Адсюль і рэакцыя бабулек на ворагаў «нашага Бацькі».

## Ад розуму індывідуальнага да калектыўнага

Неразуменне механізмаў фармавання грамадскай думкі спараджае палітыку «простых рашэнняў». Звернемся да слоўніка гісторыка Аляксандра Ахіезера: «фетышызм — ілюзорнае ўяўленне, якое часам набывае масавы характар, пра тое, што тая ці іншая з'ява ці дзеянне здольныя самі па сабе ў адрыве ад іншых з'яў быць ключом да рашэння вузлавых наспелых задач грамадства».

Віды фетышызму бясконца разнастайныя. Палітыкам, як правіла, уласціва ўпадаць у арганізацыйны фетышызм. Шмат хто з іх шчыра верыць у бязмежную сілу арганізацыйных мерапрыемстваў. Не пазбаўлены арганізацыйнага фетышызму і АП. Як тут ні прыгадаць студзеньскую спробу павялічыць эфектыўнасць дзяржаўных чыноўнікаў за кошт скарачэння іх колькасці на 25 працэнтаў.

У апазіцыйных палітыкаў свой фетыш — вера ў магчымасць здзяйснення скачку з аўтарытарызму ў дэмакратычныя шляхам арганізацыі Плошчы. Замінае таму скачку адсутнасць адзінства сярод апазіцыі. На распрацоўку арганізацыйных мерапрыемстваў па згуртаванні апазіцыі (у першую чаргу гаворка ідзе пра выбар «адзінага») прафесійныя барацьбіты з рэжымам накіроўваюць свае асноўныя інтэлектуальныя рэсурсы. Як тут ні згадаць ідэю праймерыз, здольную, нібы, не толькі вызначыць «адзінага», але і павялічыць палітычную актыўнасць грамадства.

Прыхільнікам гэтай экзатычнай працэдуры хацелася б нагадаць, што за практычным досведам па арганізацыі праймерыз не трэба далёка хадзіць. Пры дапамозе праймерыз у Расіі апазіцыя абрала Каардынацыйны савет (КС). У выніку атрымалася чарговая пляцоўка для высоўвання ўзаемных прэтэнзій. Прывяду свежы прыклад, запазычаны са стужкі навін: «Масква, 23 студзеня. Дэмакратычная фракцыя з'явілася ў Каардынацыйным савеце апазіцыі. Пра гэта паведамляе адзін з сябраў КС, сустаршыня РПР—ПАРНАС Барыс Нямцоў. «Фракцыйнасць — гэта раскол. Улічваючы тое, што аб'екты́ўна КС пакуль не набраў сілу, разбіць яго ўжо цяпер на фракцыі — самагубства. Пачнецца бардак», — лічыць Ігар Тэндзітны».

Дамарослы прыклад арганізацыйнага фетышызму — прапанова засяродзіцца не на абранні «адзінага», а на фармаванні адзінай каманды, якая выконвае ролю «адзінага цэнтра, з адзінай дактрынай, стратэгіяй і тактыкай барацьбы». Як тут ні працытаваць паліталага Глеба Паўлоўскага з нагоды расійскага варыянту адзінай каманды (КС): «Яшчэ раз пацвердзілася тэза Лявады, за якую яго ў свой час выгналі з інстытута, а інстытут зачынілі, што група людзей заўсёды адносна дурнейшая за індывідаў, якія яе складаюць. І ў суме ўяўляе сабой калектыўнага ідыёта».

## Чые інтарэсы адстойваюць партыі?

Але час ад крытыкі пераходзіць да канструктыўных прапаноў. З нагоды адсутнасці ўласных, звярнуся па дапамогу да заканадаўца эпохі Другога Храма (І стагоддзе да нашага часу) Хілеля Вавілонца: «Калі я не дзеля сябе, дык дзеля каго я? Калі толькі дзеля сябе, дык навошта я? Калі не цяпер, дык калі?»

Перанясём ідэі мысляра мінулага на сучасныя палітычныя арганізацыі. Пры ўсёй разнастайнасці тыпаў, формаў і памераў, ці маецца адзіная для ўсіх арганізацый мэта іх стварэння? Адказаць на пастаўленае пытанне нам дапаможа прызнаны аўтарытэт у пытаннях калектыўных дзеянняў эканаміст Мансур Олсан: «Мэтай амаль усіх тыпаў арганізацый з'яўляецца падтрыманне ці прасоўванне інтарэсаў сваіх сябраў. Гэта відавочна, прынамсі з эканамічнага пункту гледжання. Аднак магчыма існаванне арганізацый, якія могуць ігнараваць неабходнасць спрыяння інтарэсам сваіх удзельнікаў; некаторыя арганізацыі могуць служыць інтарэсам толькі вышэйшага кіраўніцтва».

Як гаворыцца ў вядомай дзіцячай гульні: «Цыплей, яшчэ цыплей». Калі палітычныя партыі ствараюцца не дзеля сваіх сябраў, дык дзеля каго яны? Адказ Олсана: каб рэалізаваць інтарэсы сябраў партыі. Для гэтага ў партыях і выбіраецца кіраўніцтва. На справе ж мы назіраем адваротную карціну, калі шараговыя сябры рэкрутуюцца ў партыі, каб служыць інтарэсам партыйных «лідараў».

Адсюль прывязка палітычнай дзейнасці да выбарчых кампаній, падчас якіх «лідары» рэалізуюць свае асабістыя інтарэсы. Менавіта таму пытанне пра «адзінага» і робіцца невырашальным. Спадзяюся, яшчэ не забыты 2010 год і мноства кандыдатаў у прэзідэнты.

Тут самы час узгадаць пра тактыку «малых спраў», якая ўваходзіць у моду. Ва ўмовах няроўнасці сіл улады і апазіцыі, апошняй, маўляў, варта адмовіцца на час ад бадання з уладай і засяродзіцца на падвышэнні свайго рэйтынгу пазнавальнасці. Дзеля гэтага варта «ўздымаць тыя пытанні, на якія ўлада адказаць не ў стане». З гэтай жа серыі заклікі засяродзіць высілкі апазіцыі на «новай большасці», якая нібыта сфармавалася ў Беларусі пад уздзеяннем эканамічнага крызісу.

Словам, якую прапанову ні вазьмі, яна будзе накіраваная на ўзаемадзеянне са знешнімі адносна партыйных структур суб'ектамі/аб'ектамі. Прапанову ж па працы «дзеля сябе» і днём з агнём не адшукаць.

Але калі партыі замкнуцца самі на сабе, то хто тады будзе змагацца з рэжымам? Каб адказаць на гэта пытанне, я ў чарговы раз працытую амерыканскага паліталага Адама Пшэворскага: «У Польшчы за некалькі тыдняў верасня 1980 года да «Салідарнасці» далучыліся 10 мільёнаў чалавек. Пра сваю незалежнасць заявілі нават арганізацыі, што былі створаныя рэжымам і знаходзіліся пад яго кантролем».

Дзейнасць прафсаюзу «Салідарнасць» у момант свайго стварэння абмяжоўвалася суднаверф'ю ў Гданьску. Але пры чым тут мільёны палякаў? Няўжо ўсе яны ўладкаваліся працаваць на суднаверф?

Звернемся да інтэрнэту. Усё пачалося са страйку ў абарону кранаўшчыцы Ганны Валенціновіч, звольненай дырэкцыяй суднаверфі («Калі я не дзеля сябе, дык дзеля каго я?»). Ад абароны пэўнай працаўніцы страйкавы камітэт на чале з Лехам Валенсам перайшоў да эканамічных і палітычных патрабаванняў, адрасаваных ужо не дырэкцыі верфі, а ўладам Польшчы («Калі толькі дзеля сябе, дык навошта я?»).

## У рэжыме «тут і цяпер»

Увечары 19 снежня 2010 года я не змог адшукаць аднапартыйцаў на Кастрычніцкай плошчы. Сярод дзясяткаў тысяч пратэстоўцаў знайсці «сваіх» было не так проста. Ужо падчас руху па праспекце я сустрэў кіраўніка гарадской арганізацыі Анатоля Паўлава. Да плошчы Незалежнасці мы ішлі разам.

Пагадзіцеся, кіраўнік такога рангу натуральна глядзеўся б на чале калоны гарадской партыйнай арганізацыі. Здавалася б, прыватны выпадак, але характэрны. Калі кіраўніцтва партыі ў гадзіну «Ч» не здолела мабілізаваць сваіх сябраў, дык які ў яго шанец мабілізаваць грамадства?

«Калі не цяпер, дык калі?» Жыццё — бесперапынны працэс. У дзяржаве, якая лічыць сваіх палітычных апанентаў ворагамі народа, існуе попыт на арганізацыі, у якіх апазіцыйна настроеныя грамадзяне мелі б магчымасць адчуць сябе сярод аднадумцаў. І не толькі ў момант выбарчых кампаній, а ў рэжыме «тут і цяпер».

БІЗНЭС

# «СТРАТЭГІЯ АПЯРЭДЖАННЯ» ЗАМЕСТ «САБАКІ НА СЕНЕ»

Вольга ХВОІН

**Пачалося адкрытае грамадскае абмеркаванне праекта Нацыянальнай платформы бізнэсу Беларусі–2013 (НПББ–2013). Прадпрымальнікі прапануюць уладам нарэшце адысці ад стратэгіі «сабакі на сене».**



Канстанцін Каламіец

У аснову праекта ляглі даследаванні аб працы бізнэс-асацыяцый, высновы мемарандума Сусветнага банка па Беларусі, індэкс дзелавога аптымізму краіны. Праект НПББ–2013 атрымаў назву «Стратэгія апярэджання». Яго адкрытае абмеркаванне будзе доўжыцца да 20 лютага.

Асобныя моманты праекту НПББ–2013 НЧ папрасіла пракаментаваць **віцэ-старшыню Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў Канстанціна Каламійца.**

— Наколькі мне вядома, многія прадпрымальнікі і прадстаўнікі экспертнай супольнасці мяркуюць, што на гэты раз словамі аб мадэрнізацыі ў Беларусі справа не скончыцца. Зыходзячы з аналізу стану спраў на рынках Расіі і ЕС (на нашых асноўных экспартных рынках), можна сцвярджаць, што ў бліжэйшыя 2–3 гады там пачнуцца маштабныя структурныя рэформы. Такія ж рэформы можна прагназаваць і ў беларускай эканоміцы, а затым — ва ўсёй сістэме дзяржкіравання. Мы ўсе вельмі хутка адчуем «нябачную руку рынка», даведаемся, што такое «зліццё і паглынанне», «фінанса-ва-прамысловыя групы» і г.д.

Разам з тым Канстанцін Каламіец не адмаўляе таго факту, што цяпер асноўная частка беларускага бізнэсу пазбаўленая ўвагі з боку дзяржавы. «Выключна ўважлівыя да бізнэсу толькі кантралюючыя і фіскальныя органы, — гаворыць прадстаўнік бізнэс-саюза. — Таму вынікі дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў Беларусі пакуль цешаць не ўсіх. Сапраўды, усё атрымліваецца як у Жванецкага: «Апераюць у нас добра, у нас выходжваць не ўмеюць...» Усе дырэктывы, якія тычацца нацыянальнага бізнэсу, выконваюцца толькі напалову. Горш за ўсё ў чыноўнікаў атрымліваецца выконваць пункты наконт даступных крэдытаў і ўмераных падаткаў. Таму вельмі сціплымі застаюцца і вынікі развіцця беларускага прадпрымальніцтва».

У якасці асноўных бар'ераў, якія стрымліваюць развіццё прадпрымальніцтва ў праекце НПББ–2013, называюцца неразвіты фінансавы рынак, дарагія крэдытныя рэсурсы, высокія падаткі... І гэтыя тэмы мусіруюцца з года ў год, а прасвету рэальна пакуль не прадбачыцца.

— У краінах, дзе эканоміка квітнее, з малога бізнэсу апошнюю скурку не здзіруць, а «даіць» падаткамі пачынаюць толькі пасля таго, як бізнэс вырас і набраўся сілаў. Самы распаўсюджаны адказ беларускіх чыноўнікаў пакуль такі: «Мы не абяцалі, што падатковы цяжар будзе меншы. Мы абяцалі, што падаткі плаціць будзе прасцей». Каментары беларускіх прадпрымальнікаў з нагоды кошту крэдытных рэсурсаў, недаразвітага рынку каштоўных папер наша газета проста не апублікуе. Цэнзура не прапусціць... — нявесела жартуе Канстанцін Каламіец.

— Але наша дзяржава — не «бедны сваяк», — працягвае бізнэсовец. — Праблема ў тым, што чыноўнікі не ўмеюць эфектыўна кіраваць дзяржуласнасцю. Лепш за ўсё ў іх пакуль атрымліваецца дзяліць бюджэт. Часта чыноўнікі бескантрольна інвестуюць грошы падаткаплацельшчыкаў не ў прыярытэтныя праекты. Патрэбен дадатковы кантроль і экспертыза праектаў з боку экспертнай супольнасці і грамадзянскай супольнасці. Дрэнна чыноўнікі ўмеюць пазычаць інвестыцыйныя рэсурсы, размяркоўваць рызыкі паміж удзельнікамі праекта. Прадпрымальнікі многія гады таксама спрабуюць ім растлумачыць, што для рэалізацыі большай часткі інвестыцыйных праектаў малога бізнэсу бюджэтныя грошы не патрэбныя. Каб гэта зразумець, чыноўніку дастаткова хоць бы прачытаць артыкул №1 «Інвестыцыйнага Кодэкса Рэспублікі Беларусь»: у якасці інвестыцыйных рэсурсаў могуць выступаць і зямля, і лес, і непатрэбныя вытворчыя плошчы дзяржпрадпрыемстваў, і іншыя аб'екты нерухомасці, і аб'екты інтэлектуальнай уласнасці і гэтак далей.

— Засекі Радзімы ломяцца ад звышнарматыўных запасаў гатовай прадукцыі! Значная частка гэтых тавараў з'яўляецца інвестыцыйнай (станкі, машыны, абсталяванне). Малы бізнэс здольны запусціць гэтыя рэсурсы ў гаспадарчы абарот і папоўніць даходы бюджэту, не атрымліваючы пры гэтым ніякіх бюджэтных субсідый. Праблема яшчэ ў тым, што чыноўнікі Беларусі і многіх іншых краін эфектыўнасць кіравання разумеюць вельмі своеасабліва. Сёння ёсць адчуванне, што беларускім чыноўнікам прасцей ці больш выгадна будзе папоўніць казну, прадаўшы «Белкалій», чым запусціць у гаспадарчы абарот неліквіды і атрымаць дадатковыя паступленні ў бюджэт. Таму, каб выжыць ва ўмовах другой хвалі крызісу, цяперашнюю стратэгію ўраду «сабакі на сене» неабходна замяніць на стратэгію «Да мадэрнізацыі РАЗАМ», — дадае віцэ-старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў.

Канстанцін Каламіец звяртае ўвагу на той факт, што цяпер у сувязі з уступленнем дзяржавы ў Мытны саюз і АЭП і адначасовым ігнараваннем інтарэсаў беларускага прыватнага бізнэсу можна чакаць у бліжэйшыя гады экспансіі расійскіх, кітайскіх, кіпрскіх кампаній. Беларускія ж прадпрымальнікі ў такіх умовах папросту могуць стаць лішнімі ў сваёй краіне.

Сёлета ў праекце НПББ–2013 ставіцца амбіцыйная задача ўзгадніць пазіцыі бізнэс-супольнасці, разам з тым прыклады змагання з дзяржавай прадпрымальнікаў за свае інтарэсы паказваюць, што прыватны бізнэс у краіне раздроблены. Дык ці ёсць шанцы вось так імгненна аб'яднаць людзей, якія не зрабілі гэтага самастойна, хаця матывацыя была вялікай?

— Адзін з самых негатыўных вынікаў: за 20 гадоў нашай незалежнасці ёсць мала прыкладаў, калі беларускі бізнэс дамогся прыкметных поспехаў на міжнародным рынку. У цяперашніх умовах зрабіць маналітнай бізнэс-супольнасць Беларусі на працягу года, на маю думку, зможа толькі новая хваля крызісу або новае кіраўніцтва. Я не выключаю ні аднаго, ні другога, — рэзюмуе суразмоўца.

За сем гадоў дзеяння НПББ адбыўся пераход на плоскую шкалу падаткаабкладання даходаў, былі спрошчаны адміністрацыйныя працэдуры, распачата рэфармаванне кантрольна-праверачнай дзейнасці. Ажыццёўлены добраахвотны пераход на штоквартальныя тэрміны выплаты падатку на дабаўленую вартасць (ПДВ) суб'ектамі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва незалежна ад аб'ёмаў рэалізацыі тавараў (работ, паслуг). Прымяненне Адзінай тарыфнай сеткі стала насіць рэкамендацыйны характар для прадпрыемстваў з доляй дзяржаўнай уласнасці менш за 50%. Скарацілася колькасць ліцэнзуемых відаў дзейнасці і іншае.

Любы грамадзянін краіны ў пісьмовым выглядзе можа ўнесці свае прапановы ў НПББ–2013. Для разгляду канчатковага тэксту платформы створана спецыяльная камісія на чале з міністрам эканомікі Беларусі Мікалаем Снапковым. Тэкст будзе прадстаўлены на Асамблеі дзелавых колаў 13 сакавіка.

СТАТЫСТЫКА

# ПАЦІХУ ВЫМІРАЕМ

Канстанцін СКУРАТОВІЧ

**Нядаўна здарыўся выпадак, пра які кажуць: хвост загадаў сабаку, куды бегчы. Лукашэнка наведаў Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр неўралогіі і нейрахірургіі і звярнуўся з пільным наказам да ўсяго грамадства.**

Маўляў, «да 2015 года кроў з носа трэба выйсці на натуральны прырост насельніцтва, без уліку знешняй міграцыі». Гэтае «кроў з носа» ілюструе нейкую недасведчанасць у ацэнцы дэмаграфічнай сітуацыі.

Між іншым, Белстат паведамляе, што «дэмаграфічная сітуацыя ў Рэспубліцы Беларусь працягвае паляпшацца». У прыватнасці, па іх дадзеных, немаўлят у гэтым годзе стала больш. Відаць, вельмі статыстыкам хацелася, каб іх пахвалілі. Ну і атрымалі: перад імі паставілі стратэгічнае заданне па аднаўленні людскога патэнцыялу ў краіне з апорай на ўласныя рэсурсы.

На працягу ўсіх пасляваенных гадоў колькасць насельніцтва Беларусі падвышалася. Але з сямідзясятых гадоў мінулага стагоддзя нараджальнасць пачала скарачацца. І ад 1993 года ў Беларусі колькасць памерлых перавышае колькасць народжаных. У 1993 годзе натуральныя страты насельніцтва яшчэ перакрываліся эміграцыйным прыростам, але ад 1994 года агульная колькасць насельніцтва пачала памяншацца нават з улікам мігрантаў.

З гэтага можна зрабіць такія высновы: па-першае, ужо 20 гадоў колькасць памерлых перавышае колькасць немаўлят, па-другое, дзякуючы дадатковаму міграцыйнаму прыросту, які таксама памяншаецца, насельніцтва краіны скарачаецца не так хутка, як тое было б без міграцыі. Патрэцяе, сувязь паміж прыходам да ўлады Лукашэнкі і абсалютным скарачэннем колькасці насельніцтва — выпадковая. То бок упльываць на гэтыя працэсы кіраўнік Беларусі не мае ніякай магчымасці, што рабіць — не ведае.

Прывядзём некалькі лічбаў. На 1 студзеня 2013 года колькасць насельніцтва склала 9,46 мільёна чалавек. Менавіта такая ж колькасць насельніцтва (9,46 мільёна чалавек) у Беларусі пражывала ў 1978 годзе. Калі лічыць людзей асноўным вытворчым фактарам, то краіна адкацілася па чалавечаму патэнцыялу на 40 гадоў назад.

Дэмографы, якія рабілі разлікі перад перапісам 2009 года, удакладняюць: усяго за 1993–2008 гады ў Беларусі памерла 2,2 мільёна чалавек, а нарадзілася толькі 1,55 мільёна, у выніку чаго натуральныя страты склалі 650 тысяч чалавек. Гэта перавышае колькасць насельніцтва 10 адміністрацыйных раёнаў, ці больш, чым насельніцтва Гомеля — другога па велічыні горада Беларусі. Да 1993 года насельніцтва краіны падвышалася дзякуючы раней напрацаванаму дэмаграфічнаму патэнцыялу, які цяпер ужо цалкам скарыстаны.



Кажуць, статыстыка ведае ўсё. Таму паспрабуем паразважаць, маючы на ўвазе аб'ектыўную інфармацыю, якую Белстат друкуе ў СМІ. Прыкладам, толькі ў Мінску ў параўнанні з абласцямі колькасць насельніцтва вырасла, а астатнія буйнейшыя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі згубілі насельніцтва. Гэта ўжо тэндэнцыя: вялікая колькасць унутраных і вонкавых мігрантаў імкнецца атрымаць жытло і працу ў сталіцы. Натуральны прырост насельніцтва летась меў таксама толькі Мінск, дзе колькасць немаўлят перавысіла колькасць памерлых на 4 938 чалавек. Астатнія вобласці мелі натуральныя страты насельніцтва, сярод якіх аўтсайдэрам стала Віцебская — мінус 5 534 тысячы чалавек.

Як на арэлях штогод вагаецца статыстыка, што адлюстроўвае шлюбы і разводы. Той жа Белстат паведаміў, за 11 месяцаў 2012 года ў параўнанні з 11 месяцамі 2011 года колькасць пар, якія ўзялі шлюб, паменшылася на 11,7%, а колькасць разводаў павялічылася на 3,7%. Цікава, які кірунак з гэтай нагоды хвост прапануе сабаку?

ВЫБАРЫ

# СЕЛЬСАВЕТ — ЛІШНЯЯ АДЗІНКА

Сяргей ПУЛЬША

**Новыя мясцовыя выбары, якія павінны адбыцца ў Беларусі напрыканцы 2013 — напачатку 2014 года, могуць быць даволі спрошчанымі. Падчас абмеркавання зменаў у Выбарчы кодэкс старшыня Цэнтрвыбаркаму Лідзія Ярмошына задумалася, ці патрэбныя нам увогуле сельскія і пасялковыя Саветы.**



Лідзія Ярмошына

Ярмошына лічыць магчымым скасаванне сельскіх Саветаў «з-за таго, што там вельмі цяжка знайсці будучых кандыдатаў у дэпутаты і забяспечваць потым працу гэтых прадстаўнічых органаў, якія валодаюць вельмі невялікімі паўнамоцтвамі». «Бо зямлёй, іншымі багаццямі распараджаюцца вышэйстаячыя ўзроўні Саветаў і выканаўчых органаў», — сказала кіраўнік Цэнтрвыбаркама Беларусі.

Пакуль што, як казала Ярмошына, мы мусім дачакацца рэформы адміністрацыйна-тэрытарыяльнай сістэмы Беларусі ўвогуле. Але такія словы наводзяць на пэўныя думкі. Была ж унесена прапанова пра тое, каб праводзіць выбары ў парламент у адзін тур: маўляў, і так зразумела, хто туды пройдзе, навошта грошы марнаваць. Зараз ёсць прапанова скарачіць мясцовыя Саветы, і ніхто не дасць гарантыі, што гэтага не адбудзецца і без тэрытарыяльнай рэформы.

Сапраўды, самыя першыя ўзроўні Саветаў — сельскія, пасялковыя і гарадскія Саветы ў гарадах раённага падпарадкавання, — маюць невялікія паўнамоцтвы. Як кажа былы дэпутат Белаазёрскага гарсавета Юрась Губарэвіч, іх стае толькі на тое, каб прыняць бюджэт адміністрацыйнай адзінкі. І тое, гэты бюджэт не складаецца імі самімі — ён «спускаецца» з выканкаму вышэйшай ступені. І гэты бюджэт — смеху варты, паколькі ён зводзіцца да фінансавання органаў мясцовай улады.

Ані праблем ЖКГ, ані праблемаў аховы здароўя, ані праблемаў адукацыі ці чаго іншага гэты бюджэт не тычыцца, — усё гэта закладаецца ў «больш высокі» раённы бюджэт. Адзінае, што ў гэтым бюджэце можа быць акрамя фінансавання ўлады — дробныя грошы на нейкае добраўпарадкаванне. Таму дэпутату сельскага альбо пасялковага Савету нават «распілаваць» няма чаго.

Але гэта не значыць, што мясцовы дэпутат не можа «навесці шоргату». Самае цікавае адбываецца не напачатку года, калі мясцовыя дэпутаты зацвярджаюць бюджэт, а напрыканцы, калі падводзяць ягоныя вынікі. Вось тады дэпутаты могуць выказаць свае заўвагі і прапановы наконт выканання бюджэту, эканоміі бюджэтных сродкаў і гэтак далей. Тады мясцовы дэпутат можа пацікавіцца, за якія грошы раённая адміністрацыя, напрыклад, абвяшчае тэндэр на набыццё дарагога аўто для старшыні. Што можна было зэканоміць і куды было лепш скіраваць грошы. Такім чынам ускосна, але мясцовыя дэпутаты могуць уплываць і на бюджэт на будучы год.

Яшчэ адзін цікавы момант, са словаў Губарэвіча, — гэта калі дэпутаты абіраюць старшыню сельсавета, які, па законе, становіцца і старшынёй мясцовага выканкаму: хоць маленькі, а ўсё ж начальнік. Пытанне ў тым, што зацвердзіць гэтага «маленькага начальніка» на сваёй пасадзе павінен вышэйстаячы выканкам. Іншым разам здаралася так, што мясцовыя дэпутаты абіралі «не таго», — і яго не зацвярджалі. У выніку сістэма пачынала «тармазіць» да таго часу, калі пытанне не палюбоўна не вырашалася.

«Конкурс» на дэпутатаў сельскіх і пасялковых Саветаў сапраўды малы. Таму ў іх, як правіла, абіраюць паважаных асобаў: тых, каго добра ведаюць. Таму дэпутаты такіх Саветаў — гэта сапраўды аўтарытэтныя і паважаныя людзі. Можна сказаць, што яны «больш якасныя»: яны найлепш ведаюць праблемы сваіх выбаршчыкаў, што іх непакоіць і што ім баліць. Іншая справа, ці могуць яны на вырашэнне гэтых праблем паўплываць?

Зараз дэпутат сельсавета можа вырашыць хаця б дробныя пытанні проста за кошт таго, што ён дэпутат. Ён усё ж бліжэй да ўлады, хаця б таму, што ён абіраў старшыню выканкаму. З дэпутатам можна параіцца, можна «даць яму наказ», можна сумесна абмеркаваць пытанні і праблемы. А ён ужо, у сваю чаргу, гэтыя пытанні і праблемы абмяркуе з тым, хто «вышэй».

Справа тут яшчэ ў тым, што замест сельскіх і пасялковых Саветаў спадарыня Ярмошына нічога не прапанавала. Што будзе замест іх? Будуць прызначаць у вёску «старасту»? Але наколькі людзі будуць давяраць такому «старасце», калі яны яго не абіралі? Дзе гарантыя таго, што «стараста» не будзе нейкім «левым» чалавекам, зусім з іншага раёну і прызначаны «па-сваяцку»? Зноў жа, узнікаюць праблема карупцыі (хаця «пілінць» на месцы, як ужо казалася вышэй, няма чаго) і праблема даверу да прызначанага чалавека.

І наколькі такі прызначаны будзе сумленна выконваць свае абавязкі? Бо яго, у адрозненне ад дэпутата, людзі не абіралі.

Губарэвіч лічыць, што трэба не скасоўваць мясцовыя Саветы, а дадаць ім больш паўнамоцтваў і больш адказнасці. Трэба, каб яны самі фармавалі бюджэт сваёй тэрытарыяльнай адзінкі. Трэба, каб яны самі абіралі сабе кіраўніцтва, фармавалі выканкам. І трэба, каб яны самастойна прымалі рашэнні. Калі даць мясцовым Саветам крыху болей паўнамоцтваў, лічыць Губарэвіч, эфектыўнасць працы ўзрасце ў разы. І тады з'явіцца і попыт на «сваіх» кандыдатаў у дэпутаты, і конкурс на такія пасады будзе вышэйшым, на што якраз і наракае Ярмошына.

Так што дэпутат сельсавета — зусім не «лішняя адзінка». Гэта, хутчэй, адна з прыступак для вырашэння мясцовых праблем. Варта проста ёю карыстацца. А тое, што ўлада хоча гэтую прыступку скасаваць, сведчыць толькі пра ясе важнасць для народа.

ПРЭМІЯ

# ТРЭЦІ СЕКТАР ЖЫВЕ І НЕ ЗДАЕЦЦА

Сяргей ПУЛЬША

**У нашай краіне сама дзейнасць НДА ёсць подзвігам. Няўрадавыя арганізацыі зведваюць ціск, адмовы ў рэгістрацыі, іх дзейнасць часцяком перарываецца як Міністэрствам юстыцыі, так і міліцыяй. Але яны жывуць. І маюць намер выжыць надалей. І яшчэ ўручаюць свае прэміі.**



«Рэгіянальнай падзеяй» Асамблея вызначыла стварэнне структуры незалежнага прафсаюза на прадпрыемстве «Граніт»

У кнігарні «ЛогвінаЎ» адбылася чацвёртая штогадовая цырымонія ўзнагароджання прэміі Асамблеі няўрадавых дэмакратычных арганізацый Беларусі «Чэмпіёны грамадзянскай супольнасці–2012».

Былі намінацыі, на якіх перамога сталася прадказальнай і «без разынкі». Персонамі года былі аднаазначна названыя дзве асобы — журналісты Андрэй Пачобут і галоўны рэдактар часопісу «ARCHE» Валер Булгакаў. «Крэатывам года» быў прызнаны «шведскі дэсант плюшавых мядзведзікаў». Не выклікала сумненняў тое, што «месцам года» быў прызначаны былы офіс забароненага ўладамі праваабарончага цэнтру «Вясна». Гэты офіс напрыканцы 2012 года канфіскавалі, аднак да апошняга праваабаронцы ажыццяўлялі ў ім сваю дзейнасць.

«Рэгіянальнай падзеяй» Асамблея вызначыла стварэнне структуры незалежнага прафсаюза на прадпрыемстве «Граніт».

Канфлікт на «Граніце» разгарэўся напрыканцы 2011 года. Тады каля 600 працоўных прадпрыемства ў знак пратэсту супраць нізкіх заробкаў і хамскага стаўлення адміністрацыі выйшлі з афіцыйнага прафсаюза і абвясцілі аб стварэнні на прадпрыемстве ячэйкі Беларускага незалежнага прафсаюзу. Для афіцыйнага ФПБ і кіраўніцтва прадпрыемства гэта было шокам, і выклікала рэагаванне на высокім узроўні. Нават старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін Сумар павінен быў выехаць на прадпрыемства, запатрабаваў зняць гендырэктара і паабяцаў, што «незалежнага прафсаюза на «Граніце» не будзе».

Арганізатары незалежнага прафсаюза зазналі і звальненні, і суды, і ціск кіраўніцтва, але не здаліся. Больш за тое, яны паднялі сваю праблему на міжнародны ўзровень, і атрымалі дапамогу адтуль, адкуль не чакалі. За «гранітаўцаў» заступіліся нават працоўныя Венесуэлы.

Юрыдычна незалежнага прафсаюзу на «Граніце» дагэтуль няма. Прафсаюз не можа дамагчыся рэгістрацыі, паколькі яму ўпарта не прадстаўляюць юрыдычны адрас. Але ж большасць патрабаванняў працоўных выканана. «Заробкі выраслі з 2,7–3,5 да 10–15 мільёнаў рублёў. Дамагліся мы і пазітыўных зрухаў у плане ліквідацыі хамскага стаўлення адміністрацыі да работнікаў. Працоўных хаця б зараз не называюць рабамі, як гэта было яшчэ год таму», — распавядае адзін з арганізатараў незалежнага прафсаюзу на прадпрыемстве Алег Стахаевіч.

Але далося гэта, канешне ж, дорага. Некалькі актывістаў прафсаюза звольнілі. «Цяпер звольнены Генадзь Паўлоўскі працуе кіроўцам-міжнароднікам. Віталь Пашэчка і Мікалай Карышаў перабіваюцца на падпрацоўках. Праблемы з працаўладкаваннем мае Людміла Ліцвінка, якую адмаўляюцца ўзяць на працу ў многіх арганізацыях Лунінецкага раёна. Але самае галоўнае, што ніхто з нашых звольненых актывістаў не згубіўся, кожны годна вытрымаў гэтыя выпрабаванні», — кажа Стахаевіч.

«Рэгістрацыяй года», паводле Асамблеі, стала рэгістрацыя прыватнай культурна-асветніцкай установы «Платформ Інавэйшн». «Платформа» занялася тым, да чаго ў іншых праваабаронцаў «не даходзілі рукі»: праблемай зняволеных і людзей пад следствам. Менавіта дзякуючы «Платформе» грамадства даведалася пра шэраг «турэмных бунтаў», калі зняволеныя вымушаны былі ўскрываць сабе вены, каб дамагчыся належных адносінаў з боку адміністрацыі калоній. Менавіта «Платформа» праводзіла, ды і зараз праводзіць, маніторынг умоў утрымання людзей у турмах.

Зразумела ж, такую арганізацыю ўлады доўга трываць не змаглі, і яна была ліквідаваная, адпрацаваўшы крыху больш за год. Але як з гэтай сітуацыі выкруціліся «Платформа»!

Яны не сталі чакаць прадказальных вердыктаў судоў. Ужо перад першым пасяджэннем суда наконт ліквідацыі «Платформы» Андрэй Бандарэнка заявіў, што таварыства з абмежаванай адказнасцю «Платформа» зарэгістравана ў Вялікабрытаніі: «PlatformaRB.Ltd». І адразу ж стаў рыхтаваць новае аб'яднанне, якім стала «Платформ Інавэйшн». Вышэйшы гаспадарчы суд яшчэ не разглядзеў усе скаргі па ліквідацыі «Платформы», калі было заяўлена пра рэгістрацыю «Платформ Інавэйшн». Ды з новым якасным станам — да сябраў новай арганізацыі далучыўся Генадзь Грушавы, былы кіраўнік фонду «Дзецям Чарнобыля» і ўвогуле легендарная для грамадскасці Беларусі асоба.

Ну а прэмію «Адмова года» можна лічыць антыпрэміяй для Мінгарвыканкаму, пажарных і міліцыі. За 2012 год яны тройчы адмовілі ў памяшканні «Арт-сядзібе». Што нарабіла «Арт-сядзіба»? Прадстаўляла пляцоўку для публічных лекцыяў, прагляду кінафільмаў, абмеркавання культурных падзей і прэзентацый. Здавалася б, улады павінны радавацца, што маладзёны не «швэндаюцца па вуліцах», а павышаюць свой адукацыйны і культурны ўзровень. Але, як высветлілася, «несанкцыянавана» павышаць сваю адукацыю і культуру ў нашай краіне забаронена.

«Новай ініцыятывай» назвалі «Марафон салідарнасці «Свабоду палітвязням», які штотыднёва ладзіцца ва Управе БНФ. Гэтыя акцыі не даюць забыцца на тых, хто зараз за кратамі. А «Кампаніяй года» была названа Беларуская антыядзерная кампанія, — хутчэй, авансам. Бо пакуль будуецца АЭС, беларускія антыядзершчыкі яшчэ пакажуць сябе.

Карацей, «трэці сектар» Беларусі, насуперак усяму, жыве. Хто сваёй мужнасцю, хто сваёй крэатыўнасцю, а хто і проста сваім існаваннем даказвае: калі людзі аб'яднаюцца для вырашэння пэўнай праблемы, ім ніхто не перашкодзіць.

# TV ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## 11 ЛЮТАГА, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1 БЕЛАРУСЬ

**06.00,07.15, 08.20** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.50** Навіны.
**07.05, 08.05** Дзелавое жыццё.
**07.10, 08.10** Зона Х.
**09.10** У цэнтры ўвагі.
**10.05** Меладрама «Там, дзе жыве каханне».
**12.10** Клуб рэдактараў.
**12.55** Вакол планеты.
**13.35** Eurovision. Вынікі тыдня.
**13.55** Журналісцкае расследаванне.
**14.25** Таямніцы следства.
**15.10, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Меладрама «Жорсткі раманс» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**17.45** Дак. серыял «Містычныя гісторыі».
**19.20** «Трыўмф. Героям спорту «. Дзённік.
**19.35, 23.35** Зона Х. Крымінальныя навіны.
**19.55** Серыял «Джамайка» (Расія -Украіна).
**21.00** Панарама.
**21.40** Форум.
**22.40** Дэтэктыўны серыял «Бігль» (Расія).
**00.05** Дзень спорту.
**00.20** Фантастычны серыял «Зорная брама. Першы атрад» (ЗША-Канада).

### ОНТ

**06.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.05** «Жыць здорава!».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «І танна, і хітра».
**12.00** «Святлана Кручкова. Я навучылася проста жыць…».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Добрага здароўейка!».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Ты не адзін».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Адкрыты фармат».
**22.10** «Вячэрні Ургант».
**22.50** Прэм'ера. «Адзін шанец з тысячы».
**23.50** «Да смерці прыгожая». Шматсерыйны фільм.
**00.40** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**09.00** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**10.10** «Жыць будзеце».
**10.40** «Пад абаронай».
**11.10** «Прошаная вячэра».
**12.05** «Сямейныя драмы».
**13.00** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30** Канцэрт М.Задорнава.
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Следакі». Серыял.
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Прошаная вячэра».
**18.30** «Слова жанчыне». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** Фільм «Паства». ЗША, 2006 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Ваенная таямніца».
**00.40** «Пякельная кухня - 2».

### 2 БЕЛАРУСЬ

**07.00** Рэгіянальная праграма.
**08.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Серыял «Следства вядзе Да Вінчы».
**10.10** Навіны надвор'я.
**10.45** Эксцэнтрычная камедыя «Залатое цяля» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**14.10** Пад грыфам «Вядомыя».
**14.45** Парушаючы запаведзі.
**14.35** Дэтэктыў «Жураў» (Расія).
**16.45** Беларуская часіна.
**17.55** Рэгіянальная праграма.
**18.55** Дэтэктыўны трылер «Дзесяць негрыцят» (СССР).
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** КЕНО.
**21.30** Дэтэктыў «Жураў» (Расія).
**22.35** Самба. Этап кубка свету «Адкрыты чэмпіянат Рэспублікі Беларусь».
**00.10** Авертайм.
**00.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Справа Х. Следства працягваецца». Ток-шоў.
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Ранішняя@пошта».
**12.00** «Прамы эфір».
**12.50** «Шукальнікі».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «1000 дробязяў». Ток-шоў.
**15.10** «Пра самае галоўнае». Ток-шоў.
**15.55** «Шукальнікі».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** Мясцовы час. Весткі - Масква.
**17.45** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.55** «Інстытут высакародных дзяўчын». Тэлесерыял.
**18.50** «Ефрасіння. Тайговае каханне». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Было каханне».
**22.15** Тэлесерыял «Мар'еў гай».
**00.05** Навіны - Беларусь.
**00.15** «Апошняя справа маёра Проніна».

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.10** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**11.10** «Да суда».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** Серыял «Муж і жонка».
**15.15** «Справа густу».
**15.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**19.00** Сёння.
**19.35** Серыял «Марскія д'яблы. Віхраслуп».
**21.15** Серыял «Самотны воўк».
**22.55** Сёння. Вынікі.
**23.25** Фільм «Маё апошняе першае каханне».

### МИР

**05.00** Т/с «Агонь кахання».
**06.40** М/с «Апошні з магікан».
**07.10** «Цік-так».
**07.40** «Джэймі: Абед за 30 мінуць».
**08.10** Т/с «Сэрцу не загадаеш».
**09.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці.
**09.10** Т/с «Гарачы лёд».
**11.00** Выніковая праграма «Разам».
**12.25** «Агульны рынак».
**12.40** «Навіны Садружнасці. Культура».
**13.15, 01.40** М/ф «Следства вядуць знаўцы».
**15.25** Т/с «Заручальны пярсцёнак».
**17.00** Ток-шоў «Слова за слова».
**18.30** «Акцэнты».
**18.50** «Саюзнікі».
**19.15** «Усюды жыццё».
**19.45** «Сардэчна запрашаем».
**20.10** «Беларусь сёння».
**21.25** «Свет спорту».
**21.55, 03.10** Д/ф «У свеце сакрэтных ведаў».
**22.45** Ток - шоў «Слова за слова».
**23.35** Т/с «Камісар Навара».
**01.15** «Зроблена ў СССР».
**04.00** Д/ф «Цюркі Расіі».

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** ПраСвет.
**07.25** Зона «Свабоды».
**07.55, 14.55** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**08.20, 15.25** Дак. гадзіна: «Горад жанчын», дак. фільм, 1999 г., Польшча–Германія.
**09.05** Два на два (тэледыскусія).
**09.35** Euromaxx.
**10.05** Форум (ток-шоу).
**10.50** «Сенсацыі XX стагоддзя», серыял: «Аперацыя «Берлін-45».
**11.40** Фільматэка майстроў: «Мой Нікіфар», маст. фільм, 2004 г., Польшча.
**13.20** Эксперт (сатырычная праграма).
**13.55** Невядомая Беларусь: «Найвышэйшая мера», дак. фільм, 2012 г., Беларусь.
**14.30** ПраСвет.
**16.15** Два на два (тэледыскусія).
**16.40** Форум (ток-шоу).
**17.25** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**17.40** Відзьмо-невідзьмо: выд. 17.
**18.05** Еўропа сёння.
**18.35** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**18.50** Калыханка для самых маленькіх.
**19.00** Студыя «Белсат»: інфармацыйна-публіцыстычны вечар (жывы эфір).
**19.15** Студыя «Белсат»: Дэвайс.
**19.20** Студыя «Белсат»: Агляд медыяў.
**19.30, 20.15** Гарачы каментар.
**20.00** Студыя «Белсат»: Навіны.
**20.10** Агляд падзеяў культуры.
**20.40, 01.05** Асабісты капітал.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Не прапусці! (параднік гледача).
**21.40** Студыя «Белсат»: Мінуў дзень.
**21.45** Фільматэка майстроў: «Мой Нікіфар», маст. фільм, 2004 г., Польшча.
**23.25** Студыя «Белсат».
**00.55** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**01.20** Аб'ектыў.
**01.50** Не прапусці! (параднік гледача).
**02.05** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы.

## 12 ЛЮТАГА, АЎТОРАК

### 1 БЕЛАРУСЬ

**06.00, 07.15, 08.20** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.10** Навіны.
**07.05, 08.05** Дзелавое жыццё.
**07.10, 08.10** Зона Х.
**09.10** Серыял «Маруся. Выпрабаванні».
**10.05** Серыял «Джамайка» (Расія -Украіна).
**11.00** Дак. серыял «Пад сонцам» (ЗША).
**12.10** «Трыўмф. Героям спорту «. Дзённік.
**12.25** Дак. серыял «Будзь у тонусе!».
**13.00** Дак. серыял «Цуды прыроды».
**13.30** Дакументальны серыял «Майстар вандраванняў» (ЗША).
**14.00** Дэтэктыўны серыял «Бігль» (Расія).
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Фантастычны серыял «Зорная брама. Першы атрад».
**16.20** Культурныя людзі +.
**16.55** «Здароўе». Ток-шоў.
**17.45** Серыял «Маруся. Выпрабаванні».
**19.20** Сфера інтарэсаў.
**19.40, 22.50** Зона Х. Крымінальныя навіны.
**20.00** Серыял «Джамайка» (Расія -Украіна).
**21.00** Панарама.
**21.55** Дэтэктыўны серыял «Бігль» (Расія).
**23.25** Дзень спорту.
**23.35** Фантастычны серыял «Зорная брама. Першы атрад» (ЗША-Канада).
**00.25** Дак. серыял «Пад сонцам» (ЗША).

### ОНТ

**06.00, 08.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Жыць здорава!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «І танна, і хітра».
**12.05** «Няроўны шлюб». Шматсер. фільм.
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Добрага здароўейка!».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Ты не адзін».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Два з паловай чалавекі». Шматсерыйны фільм.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Грак». Шматсер. фільм.
**23.10** «Вячэрні Ургант».
**23.50** «Да смерці прыгожая». Шматсерыйны фільм.
**00.40** Начныя навіны.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**09.00** «Вялікі сняданак».
**09.40** «Такі лёс».
**10.40** «Пад абаронай».
**11.10** «Прошаная вячэра».
**12.05** «Сямейныя драмы».
**13.00** «Цэнтральны рэгіён».
**13.50** Фільм «Паства». ЗША, 2006 г.
**15.45** «Дзіўная справа».
**16.50** «Следакі». Серыял.
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Прошаная вячэра».
**18.30** «Слова жанчыне». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** Фільм «Афрыканец». Францыя, 1983 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Жывая тэма».
**23.55** «Аўтапанарама».
**00.15** «Нам і не снілася»: «Не нарадзіся прыгожай».
**01.05** «Турэцкі гамбіт». Серыял.

### 2 БЕЛАРУСЬ

**07.00** Рэгіянальная праграма.
**08.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Серыял «Следства вядзе Да Вінчы».
**10.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.
**11.05** Авертайм.
**11.40** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**12.35** Цела чалавека.
**13.05** Дэтэктыўны трылер «Дзесяць негрыцят» (СССР).
**15.35** Дэтэктыў «Жураў» (Расія).
**16.45** Беларуская часіна.
**17.55** Рэгіянальная праграма.
**18.55** Баскетбол.
**20.45** Імперыя песні. На біс.
**21.20** Тэлебарометр.
**21.25** КЕНО.
**21.30** Дэтэктыў «Жураў» (Расія).
**22.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1\8 фіналу. Прамая трансляцыя.
**00.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1\8 фіналу.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** «Справа Х. Следства працягваецца». Ток-шоў.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Мая планета».
**12.00** «Прамы эфір».
**12.50** Тэлесерыял «Гром».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «1000 дробязяў». Ток-шоў.
**15.10** «Пра самае галоўнае». Ток-шоў.
**15.55** Тэлесерыял «Сонька. Працяг легенды».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.30** Мясцовы час. Весткі - Масква.
**17.45** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.55** «Інстытут высакародных дзяўчын». Тэлесерыял.
**18.50** «Ефрасіння. Тайговае каханне». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Было каханне».
**22.20** Тэлесерыял «Мар'еў гай».
**00.05** Навіны - Беларусь.
**00.15** «Адмысловы карэспандэнт».

### НТВ

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.10** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**11.00** «Да суда».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** Серыял «Муж і жонка».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**19.00** Сёння.
**19.35** Серыял «Марскія д'яблы. Віхраслуп».
**21.15** Серыял «Самотны воўк».
**22.55** Сёння. Вынікі.
**23.20** Вострасюжэтны серыял «Чужы раён».

### МИР

**05.00** Т/с «Агонь кахання».
**06.40** М/с «Апошні з магікан».
**07.10** «Цік-так».
**07.40** «Джэймі: Абед за 30 мінуць».
**08.10** Т/с «Сэрцу не загадаеш».
**09.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці.
**09.10** Т/с «Гарачы лёд».
**10.45** «Незорнае дзяцінства».
**11.15** «Агульны інтарэс».
**11.40** «Простая мова».
**12.25** Т/с «Трое зверху».
**13.15, 03.20** М/ф «Следства вядуць знаўцы».
**15.25** Т/с «Заручальны пярсцёнак».
**17.00, 22.45** Ток-шоў «Слова за слова».
**18.30** «Акцэнты».
**18.50, 01.40** Т/с «Закон і парадак».
**21.25** «Дыяспары».
**21.55** Д/ф « У свеце мінулага».
**23.35** Т/с «Камісар Навара».
**01.15** «Усюды жыццё».

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Студыя «Белсат».
**08.30** Асабісты капітал.
**08.45** Аб'ектыў.
**09.10** Не прапусці! (параднік гледача).
**09.30** Еўропа сёння.
**10.00** «Тата», маст. фільм, 1995 г., Польшча.
**11.05** Студыя «Белсат».
**13.25** Асабісты капітал.
**13.40** Аб'ектыў.
**14.05** Не прапусці! (параднік гледача).
**14.25** Еўропа сёння.
**14.55** «Тата», маст. фільм, 1995 г., Польшча.
**16.50** «Афіцэры», дэтэктыўны серыял: 10 серыя.
**17.35** Эксперт (сатырычная праграма).
**18.05** На колах.
**18.35** Без рэтушы: «Маланка аркестр», рэпартаж, 2012 г., Беларусь.
**18.45** Калыханка для самых маленькіх: «Фільм са страшнаю назваю».
**19.00** Студыя «Белсат»: інфармацыйна-публіцыстычны вечар (жывы эфір).
**19.15** Студыя «Белсат»: Сальда.
**19.20** Студыя «Белсат»: Агляд медыяў.
**19.30** Студыя «Белсат»: Гарачы каментар.
**20.00** Студыя «Белсат»: Навіны.
**20.15** Студыя «Белсат»: Гарачы каментар.
**20.30** Чорным па белым (культурніцкая праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.30** Студыя «Белсат»: Размова У. Мацкевіча / М. Жбанкова.
**21.40** Студыя «Белсат»: Мінуў дзень (інфармацыйнае падсумаванне дня).
**21.45** «Доктар Марцін», серыял: 6 серыя.
**22.35** Назад у будучыню.
**22.50** Форум (ток-шоу).
**23.35** Студыя «Белсат».
**01.05** Чорным па белым (культурніцкая праграма).
**01.35** Аб'ектыў.
**02.00** Студыя «Белсат»: Размова У. Мацкевіча / М. Жбанкова.
**02.20** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 13 ЛЮТАГА, СЕРАДА

**06.00, 07.15, 08.20** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.10** Навіны.
**07.05, 08.05** Дзелавое жыццё.
**07.10, 08.10** Зона Х.
**08.45** Слова Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча.
**09.10** Серыял «Маруся. Выпрабаванні».
**10.05** Серыял «Джамайка» (Расія -Украіна).
**11.00** Дак. серыял «Пад сонцам» (ЗША).
**12.10** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.25** Сфера інтарэсаў.
**12.45** Заўтра - гэта мы!
**13.15** Перазагрузка.
**14.00** Дэтэктыўны серыял «Бігль» (Расія).
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Фантастычны серыял «Зорная брама. Першы атрад» (ЗША-Канада).
**16.20** «Усё як мае быць!» Забаўляльная праграма.
**16.50** Зямельнае пытанне.
**17.15** Медычныя таямніцы.
**17.45** Меладраматычны серыял «Маруся. Выпрабаванні» (Украіна).
**19.20** Сфера інтарэсаў.
**19.40, 22.50** Зона Х. Крымінальныя навіны.
**20.00** Серыял «Джамайка» (Расія-Украіна).
**21.00** Панарама.
**21.55** Дэтэктыўны серыял «Бігль» (Расія).
**23.25** Дзень спорту.
**23.40** Фантастычны серыял «Зорная брама. Першы атрад» (ЗША-Канада).
**00.25** Дак. серыял «Пад сонцам» (ЗША).

**06.00, 08.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «І танна, і хітра».
**12.05** «Няроўны шлюб». Шматсер. фільм.
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Добрага здароўейка!».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Ты не адзін».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Два з паловай чалавекі». Шматсерыйны фільм.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Грак». Шматсер. фільм.
**23.10** «Вячэрні Ургант».
**23.50** «Да смерці прыгожая». Шматсерыйны фільм.
**00.40** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**09.00** «Гадзіна суда».
**09.55** «Жыць будзеце».
**10.05** «Аўтапанарама».
**10.40** «Пад абаронай».
**11.10** «Прошаная вячэра».
**12.05** «Сямейныя драмы».
**13.00** «Мінск і мінчане».
**13.50** Фільм «Афрыканец». Францыя, 1983 г.
**15.40** «Жывая тэма».
**16.50** «Следакі». Серыял.
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Прошаная вячэра».
**18.30** «Слова жанчыне». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** Фільм «Браты - супернікі». Аўстралія - Вялікабрытанія, 2004 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**23.55** «Дабро пажаліцца».
**00.15** «Нам і не снілася»: «Не нарадзіся прыгожай».
**01.05** «Турэцкі гамбіт». Серыял.

**07.00** Рэгіянальная праграма.
**08.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** серыял «Следства вядзе Да Вінчы».
**10.10** Наперад у мінулае.
**10.45** Дакументальна-пазнавальны серыял «Мудрагелістыя светы» (ЗША - Паўднёвая Карэя).
**12.05** «Час яе сыноў» («Беларусьфільм»). 1-я і 2-я серыі.
**14.45** Вострасюжэтны дэтэктыў «Гонкі па вертыкалі» (СССР). 1-я серыя.
**16.10** Беларуская часіна.
**17.20** Рэгіянальная праграма.
**18.25** Хакей. КХЛ. Прамая трансляцыя.
**20.45** Біятлон. Чэмпіянат свету. Індывідуальная гонка. Жанчыны. У перапынку. 21.25 Спортлато 5 з 36, 21.30 КЕНО.
**22.30** Тэлебарометр.
**22.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1\8 фіналу. Рэал - Манчэстар Юнайтэд. Прамая трансляцыя.
**00.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1\8 фіналу. Шахцёр - Барусія.

РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** «Справа Х. Следства працягваецца». Ток-шоў.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Мая планета».
**12.00** «Прамы эфір».
**12.50** Тэлесерыял «Гром».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «1000 дробязяў». Ток-шоў.
**15.10** «Пра самае галоўнае». Ток-шоў.
**15.55** Тэлесерыял «Сонька. Працяг легенды».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.30** Мясцовы час. Весткі - Масква.
**17.45** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.55** «Інстытут высакародных дзяўчын». Тэлесерыял.
**18.50** «Ефрасіння. Тайговае каханне». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Было каханне».
**22.20** Тэлесерыял «Мар'еў гай».
**00.05** Навіны - Беларусь.
**00.15** «Тры капітаны. Руская Арктыка».

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.10** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Следства вялі..».
**11.10** «Да суда».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** Серыял «Муж і жонка».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**19.00** Сёння.
**19.35** серыял «Марскія д'яблы. Віхраслуп».
**21.15** серыял «Самотны воўк».
**22.55** Сёння. Вынікі.
**23.20** Вострасюжэтны серыял «Чужы раён».

**05.00** Т/с «Агонь кахання».
**06.40** М/с «Апошні з магікан».
**07.10** «Цік-так».
**07.40** «Джэймі: Абед за 30 мінуць».
**08.10** Т/с «Сэрцу не загадаеш».
**09.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці.
**09.10** Т/с «Гарачы лёд».
**10.45** «Любімыя акцёры».
**11.15** «Даведнік».
**11.40** «Кыргызтан у асобах».
**12.25** Т/с «Трое зверху».
**12.50, 02.55** М/ф «Следства вядуць знаўцы».
**15.25** Т/с «Заручальны пярсцёнак».
**17.00, 22.45** Ток-шоў «Слова за слова».
**18.30** «Акцэнты».
**18.50, 01.15** Т/с «Закон і парадак».
**21.25** «Сакрэтныя матэрыялы».
**21.55** Д/ф «Эпоха. Падзеі і людзі».
**23.35** Т/с «Камісар Навара».

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Студыя «Белсат».
**08.30** Чорным па белым.
**09.00** Аб'ектыў.
**09.25, 14.20, 21.25** Студыя «Белсат»: Размова У. Мацкевіча / М. Жбанкова.
**09.45** На колах.
**10.10** «Доктар Марцін», серыял: 6 серыя.
**11.00** Вагон.
**11.10** Форум (ток-шоу).
**11.55** Студыя «Белсат».
**13.25** Чорным па белым.
**13.55** Аб'ектыў.
**14.40** На колах.
**15.10** «Доктар Марцін», серыял: 6 серыя.
**16.00** Форум (ток-шоу).
**16.45** «Афіцэры», дэтэктыўны серыял.
**17.30** Асабісты капітал.
**17.50** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**18.00** Праект «Будучыня».
**18.30** Над Нёманам (тэлечасопіс).
**18.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.00** Студыя «Белсат»: інфармацыйна-публіцыстычны вечар (жывы эфір).
**19.15** Студыя «Белсат»: Сальда.
**19.20** Студыя «Белсат»: Агляд медыяў.
**19.30** Студыя «Белсат»: Гарачы каментар.
**20.00** Студыя «Белсат»: Навіны.
**20.15** Студыя «Белсат»: Гарачы каментар.
**20.35** Маю права (юрыдычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.40** Студыя «Белсат»: Мінуў дзень.
**21.45** «Польская кухня», серыял: 6 серыя.
**22.50** Два на два (тэледыскусія).
**23.15** Невядомая Беларусь: «Найвышэйшая мера», дак. фільм, 2012 г., Беларусь.
**23.50** Студыя «Белсат».
**01.30** Маю права (юрыдычная праграма).
**01.50** Аб'ектыў.
**02.15** Студыя «Белсат»: Размова У. Мацкевіча / М. Жбанкова.
**02.35** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).

## 14 ЛЮТАГА, ЧАЦВЕР

**06.00, 07.15, 08.20** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**07.05, 08.05** Дзелавое жыццё.
**07.10, 08.10** Зона Х.
**09.10** Меладраматычны серыял «Маруся. Выпрабаванні» (Расія-Украіна).
**10.05** Серыял «Джамайка».
**11.00** Дак. серыял «Пад сонцам» (ЗША).
**12.10** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.25** Сфера інтарэсаў.
**12.45** Каробка перадач.
**13.20** Таямніцы следства.
**14.00** Дэтэктыўны серыял «Бігль» (Расія).
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Фантастычны серыял «Зорная брама. Першы атрад» (ЗША-Канада).
**16.20** Дакументальны фільм «Віталь Цвірко. Паэзія пейзажу».
**16.50** Дакументальны серыял «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**17.45** Меладраматычны серыял «Маруся. Выпрабаванні» (Расія-Украіна).
**19.20** Сфера інтарэсаў.
**19.40, 23.35** Зона Х. Крымінальныя навіны.
**20.00** Серыял «Джамайка».
**21.00** Панарама.
**21.55** Дэтэктыўны серыял «Бігль» (Расія). Заключныя серыі.
**00.10** Дзень спорту.
**00.20** Фантастычны серыял «Зорная брама. Першы атрад» (ЗША-Канада).
**01.10** Дак. серыял «Пад сонцам» (ЗША).

**06.00, 08.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «І танна, і хітра».
**12.05** «Няроўны шлюб». Шматсер. фільм.
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Добрага здароўейка!».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Ты не адзін».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Два з паловай чалавекі». Шматсерыйны фільм.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Грак». Шматсер. фільм.
**23.10** «Вячэрні Ургант».
**23.50** «Да смерці прыгожая». Шматсерыйны фільм.
**00.40** Начныя навіны.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**09.00** «Не хлусі мне!».
**10.05** «Дабро пажаліцца».
**10.40** «Пад абаронай».
**11.10** «Прошаная вячэра».
**12.05** «Сямейныя драмы».
**13.00** «Прыгоды дылетанта».
**13.50** Фільм «Браты - супернікі». Аўстралія - Вялікабрытанія, 2004 г.
**15.40** «Якія людзі!».
**16.50** «Следакі». Серыял.
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Прошаная вячэра».
**18.30** «Слова жанчыне». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** Фільм «Для пачынаючых кахаць». Расія, 2010 г.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Таямніцы свету з Ганнай Чапман. Выкрыццё».
**23.55** «Аўтапанарама».
**00.15** «Нам і не снілася»: «Не нарадзіся прыгожай».
**01.05** «Турэцкі гамбіт». Серыял.

**07.00** Рэгіянальная праграма.
**08.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Серыял «Следства вядзе Да Вінчы».
**10.10** Вышэй за дах.
**10.45** Дакументальна-пазнавальны серыял «Мудрагелістыя светы» (ЗША - Паўднёвая Карэя).
**11.50** Дак. фільм «Пра каханне...».
**12.20** Фантастычная камедыя «Чарадзеі» (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**15.20** Вострасюжэтны дэтэктыў «Гонкі па вертыкалі» (СССР). 2-я серыя.
**16.45** Беларуская часіна.
**17.55** Рэгіянальная праграма.
**19.05** Біятлон. Чэмпіянат свету. Індывідуальная гонка. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**20.50** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1\16 фіналу. Прамая трансляцыя. У перапынку. 21.50 КЕНО.
**22.55** Тэлебарометр.
**23.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1\16 фіналу.
**00.50** Дакументальна-пазнавальны серыял «Мудрагелістыя светы» (ЗША - Паўднёвая Карэя).

РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** «Справа Х. Следства працягваецца». Ток-шоў.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Мая планета».
**12.00** «Прамы эфір».
**12.50** Тэлесерыял «Гром».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «1000 дробязяў». Ток-шоў.
**15.10** «Пра самае галоўнае». Ток-шоў.
**15.55** Тэлесерыял «Сонька. Працяг легенды».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** Мясцовы час. Весткі - Масква.
**17.45** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.55** «Інстытут высакародных дзяўчын». Тэлесерыял.
**18.50** «Ефрасіння. Тайговае каханне». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Тэлесерыял «Было каханне».
**22.20** Тэлесерыял «Мар'еў гай».
**00.05** Навіны - Беларусь.
**00.15** «Паядынак».

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.10** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Крамлёўскія пахаванні».
**11.05** «Да суда».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** Серыял «Муж і жонка».
**15.10** «Справа густу».
**15.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.40** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**19.00** Сёння.
**19.33** Фільм «Чалавек з ніадкуль».
**21.20** Серыял «Марскія д'яблы. Віхраслуп».
**23.00** Сёння. Вынікі.
**23.25** Вострасюжэтны серыял «Чужы раён».
**00.15** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.

**05.00** Т/с «Агонь кахання».
**06.40** М/с «Апошні з магікан».
**07.10** «Цік-так».
**07.40** «Джэймі: Абед за 30 мінуць».
**08.10** Т/с «Сэрцу не загадаеш».
**09.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці.
**09.10** Т/с «Гарачы лёд».
**10.45** «Зроблена ў СССР».
**11.15** «Сардэчна запрашаем».
**11.40** «Простая мова».
**12.25** Т/с «Трое зверху».
**13.15, 03.15** М/ф «Следства вядуць знаўцы».
**15.25** Т/с «Заручальны пярсцёнак».
**17.00, 22.45** Ток-шоў «Слова за слова».
**18.30** «Акцэнты».
**18.50, 01.40** Т/с «Закон і парадак».
**21.25** «Па шчырасці».
**21.55** Д/ф «Рэцэпты шчаслівага шлюбу».
**23.35** М/ф «Расследаванне Мэрдака».
**01.15** «Беларусь сёння».

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Студыя «Белсат».
**08.35** Маю права (юрыдычная праграма).
**08.55** Аб'ектыў.
**09.20** Студыя «Белсат»: Размова У. Мацкевіча / М. Жбанкова.
**09.40** Праект «Будучыня».
**10.10** «Польская кухня», серыял: 6 серыя.
**11.15** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**11.25** Невядомая Беларусь: «Найвышэйшая мера», дак. фільм, 2012 г., Беларусь.
**12.00** Студыя «Белсат».
**13.40** Маю права (юрыдычная праграма).
**14.00** Аб'ектыў.
**14.25** Студыя «Белсат»: Размова У. Мацкевіча / М. Жбанкова.
**14.45** Праект «Будучыня».
**15.15** «Польская кухня», серыял: 6 серыя.
**16.20** Невядомая Беларусь: «Найвышэйшая мера», дак. фільм, 2012 г., Беларусь.
**16.55** «Час гонару», серыял: 8 серыя.
**17.45** Маю права (юрыдычная праграма).
**18.05** Euromaxx (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**18.35** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**18.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.00** Студыя «Белсат»: інфармацыйна-публіцыстычны вечар (жывы эфір).
**19.15** Студыя «Белсат»: Сальда.
**19.20** Студыя «Белсат»: Агляд медыяў.
**19.30** Студыя «Белсат»: Гарачы каментар.
**20.00** Студыя «Белсат»: Навіны.
**20.15** Студыя «Белсат»: Гарачы каментар.
**20.30** Рэпартэр.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Студыя «Белсат»: Размова У. Мацкевіча / М. Жбанкова.
**21.40** Студыя «Белсат»: Мінуў дзень (інфармацыйнае падсумаванне дня).
**21.45** «Каханне ля поплаву», тэлесерыял: 7 серыя.
**22.35** «Лобатамія», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**23.35** Студыя «Белсат».
**01.05** Рэпартэр.
**01.30** Аб'ектыў.
**02.00** Студыя «Белсат»: Размова У. Мацкевіча / М. Жбанкова.
**02.20** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы.

## 15 ЛЮТАГА, ПЯТНІЦА

**06.00, 07.15, 08.20** Добрай раніцы, Беларусь!
**07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.15** Навіны.
**07.05, 08.05** Дзелавое жыццё.
**07.10, 08.10** Зона Х.
**08.45** Слова Мітрапаліта Філарэта.
**09.10** Меладраматычны серыял «Маруся. Выпрабаванні» (Расія-Украіна).
**10.05** Серыял «Джамайка».
**11.00** Дак. серыял «Пад сонцам» (ЗША).
**12.10** Актуальнае інтэрв'ю.
**12.25** Сфера інтарэсаў.
**12.45** Тэлестужка АТН «Мы - спецпрызн».
**13.15** Дэтэктыўны серыял «Бігль» (Расія). Заключныя серыі.
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Фантастычны серыял «Зорная брама. Першы атрад» (ЗША- Канада).
**16.20** Дакументальны серыял «Майстар вандраванняў» (ЗША).
**16.50** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**17.45** Меладраматычны серыял «Маруся. Выпрабаванні» (Расія-Украіна).
**19.20, 23.45** Зона Х. Вынікі тыдня.
**19.55** Дак. цыкл «Зорнае жыццё».
**21.00** Панарама.
**21.55** Дакументальны серыял «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**22.55** Дак. серыял «Містычныя гісторыі».
**00.30** Дзень спорту.
**00.40** Серыял «Майстры жахаў».
**01.40** Дак. серыял «Пад сонцам» (ЗША).

**06.00, 08.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Зразумець. Прабачыць».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «І танна, і хітра».
**12.05** «Няроўны шлюб». Шматсер. фільм.
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** Прэм'ера. «Добрага здаровейка!».
**14.10** «Модны прысуд».
**15.10** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Хачу ведаць».
**17.00** «Ералаш».
**17.15** Тэорыя неверагоднасці.
**18.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Дзве зоркі».
**22.35** «Вячэрні Ургант».
**23.30** Трылер «Час ведзьмаў».
**01.10** Начныя навіны.

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**09.00** «Каханне 911».
**10.05** «Аўтапанарама».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Пад абаронай».
**11.10** «Прошаная вячэра».
**12.05** «Сямейныя драмы».
**13.00** «Добры дзень, доктар».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** Фільм «Для пачынаючых кахаць». Расія, 2010 г.
**15.40** «Хороша жыць».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Следакі». Серыял.
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Прошаная вячэра».
**18.30** «Такі лёс».
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** Фільм «Пстрыкні пальцам толькі раз.». Францыя, 2005 г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Турэцкі гамбіт». Серыял. Закл. серыя.
**00.05** Фільм «Усім патрэбна Кэт». ЗША, 2011 г.
**01.55** «Глядзець усім!».

**07.00** Навіны рэгіёна. Рэгіянальная праграма.
**08.00** Раніца.
**09.00** Тэлебарометр.
**09.05** Серыял «Следства вядзе Да Вінчы».
**10.10** Фактар сілы.
**10.45** Дакументальна-пазнавальны серыял «Мудрагелістыя светы» (ЗША - Паўднёвая Карэя).
**11.50** «Яго батальён» («Беларусьфільм»). 1-я і 2-я серыі.
**14.25** «20 гадоў. Афган. Трафеі.» Дакументальны фільм.
**15.00** Вострасюжэтны дэтэктыў «Гонкі па вертыкалі» (СССР). 3-я серыя.
**16.45** Наперад у мінулае.
**17.20** Беларуская кухня.
**17.55** Серыял «Следства вядзе Да Вінчы».
**17.55** Навіны рэгіёна (БРЭСТ).
**18.10** Моладзевае ток-шоў «Ёсць меркаванне!» (БРЭСТ).
**18.40** Постскрыптум. Аналітычная праграма (БРЭСТ).
**19.05** Біятлон. Чэмпіянат свету. Эстафета. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**20.40** Хакей. КХЛ. У перапынку. 21.55 КЕНО.
**22.45** Тэлебарометр.
**22.50** Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**23.35** Час футболу.
**00.15** Арэна.
**00.45** Фактар сілы.

**07.00** «Раніца Расіі».
**10.05** «Справа Х. Следства працягваецца». Ток-шоў.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Мая планета».
**12.00** «Прамы эфір».
**12.50** Тэлесерыял «Гром».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «1000 дробязяў». Ток-шоў.
**15.10** «Пра самае галоўнае». Ток-шоў.
**15.55** Тэлесерыял «Сонька. Працяг легенды».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.30** Мясцовы час. Весткі - Масква.
**17.45** Весткі. Дзяжурная частка.
**17.55** «Інстытут высакародных дзяўчын». Тэлесерыял.
**18.50** «Ефрасіння. Тайговае каханне». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Было каханне».
**22.20** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**00.10** Навіны - Беларусь.
**00.20** Фільм «Апошняя ахвяра» (2012 г.).
**01.55** Фільм «Каханне прыходзіць не адно» (2011 г.).

**06.00** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.10** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Крамлёўскія пахаванні».
**11.10** «Да суда».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.35** Серыял «Муж і жонка».
**15.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.00** Сёння.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоў.
**18.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**19.00** Сёння.
**19.35** Вострасюжэтны серыял «Марскія д'яблы. Віхраслуп».
**21.15** Серыял «Марскія д'яблы».
**23.05** Крымінальная меладрама «Бацькі».

**05.00** Т/с «Агонь кахання».
**06.40** М/с «Апошні з магікан».
**07.10** «Цік-так».
**07.40** «Джэймі: Абед за 30 мінуць».
**08.10** Т/с «Сэрцу не загадаеш».
**09.00, 12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці.
**09.10** Т/с «Гарачы лёд».
**10.45** «На шашлыкі».
**11.15** «Усюды жыццё».
**11.40** «Рэспубліка сёння».
**12.25** Т/с «Трое зверху».
**13.15, 03.30** М/ф «Следства вядуць знаўцы».
**15.25** Т/с «Заручальны пярсцёнак».
**17.00** «Сакрэтныя матэрыялы».
**17.30** «Злачынствы і пакаранне».
**18.30** «Акцэнты».
**18.50** М/ф «Італьянец».
**21.25** «Любімыя акцёры».
**21.55** М/ф «Набожная Марта».
**00.20** М/ф «Расследаванне Мэрдака».

**07.00** Студыя «Белсат».
**08.30** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**08.55** Аб'ектыў.
**09.20** Студыя «Белсат»: Размова У. Мацкевіча / М. Жбанкова.
**09.40** Euromaxx (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**10.10** «Каханне ля поплаву», тэлесерыял: 7 серыя.
**11.00** «Лобатамія», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**12.00** Студыя «Белсат».
**13.30** Рэпартэр.
**14.00** Аб'ектыў.
**14.25** Студыя «Белсат»: Размова У. Мацкевіча / М. Жбанкова.
**14.45** Euromaxx (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**15.15** «Каханне ля поплаву», тэлесерыял: 7 серыя.
**16.05** Чорным па белым (культурніцкая праграма).
**16.35** «Лобатамія», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**17.35** Рэпартэр.
**18.00** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**18.30** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**18.45** Калыханка для самых маленькіх: «Мядзведзікі», дак. фільм, 2001 г., Чэхія.
**19.00** Студыя «Белсат»: інфармацыйна-публіцыстычны вечар (жывы эфір).
**19.15** Студыя «Белсат»: Дэвайс.
**19.20** Студыя «Белсат»: Агляд медыяў.
**19.30** Студыя «Белсат»: Гарачы каментар.
**20.00** Студыя «Белсат»: Навіны.
**20.10** Студыя «Белсат»: Агляд падзеяў культуры.
**20.15** Студыя «Белсат»: Гарачы каментар.
**20.30** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Студыя «Белсат»: Размова У. Мацкевіча / М. Жбанкова.
**21.40** Студыя «Белсат»: Мінуў дзень (інфармацыйнае падсумаванне дня).
**21.45** «Аповеды выходнага дня», цыкл маст. фільмаў, 1996–2000 гг., Польшча: «Лінія затрымання», 1997 г.
**22.45** Эксперт (сатырычная праграма).
**23.15** Студыя «Белсат».
**00.45** ПраСвет.
**01.15** Аб'ектыў.
**01.40** Студыя «Белсат»: Размова У. Мацкевіча / М. Жбанкова.
**01.55** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).

## 16 ЛЮТАГА, СУБОТА

**07.00** Камедыя «Дзяўчына без адрасу» (СССР).
**08.30** Існасць.
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Здароўе.
**09.55** Камедыйны серыял «Суседзі» (Расія). 1-я серыя.
**11.00** «Усё як мае быць!» Забаўляльная праграма.
**11.30** Зямельнае пытанне.
**12.15** Камедыя «Міміно» (СССР).
**14.15** Вакол планеты.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** Эксцэнтрычная камедыя «Жандар з Сэн-Трапэ» (Францыя).
**17.25** Каробка перадач.
**18.00** Таямніцы следства.
**18.35** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**19.10** Камедыя «На моры» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.40** Гангстарскі трылер «Другое дыханне» (Францыя).
**00.20** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**01.15** Дзень спорту.
**01.25** Камедыйны серыял «Суседзі» (Расія). 1-я серыя.

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Смешарыкі».
**09.20** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.05** «Разумніцы і разумнікі».
**11.50** «Залаты век Сан-Рэма».
**12.45** Прэм'ера. «Рэтра FM: Зоркі Сан-Рэма ў Маскве».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**17.30** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**18.15** АНТ прадстаўляе: «Я спяваю!».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Сёння ўвечар».
**22.45** «Неверагодныя канцэрты італьянцаў у Расіі».
**23.45** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў.

**06.20** «Салдаты. Дзембель непазбежны». Серыял.
**08.10** Фільм «Пстрыкні пальцам толькі раз.». Францыя, 2005 г.
**10.10** «Чыстая праца».
**11.00** «Жанчыны ХХ стагоддзя».
**11.30** «Мінск і мінчане».
**12.05** «Сакрэтныя тэрыторыі».
**13.05** «Прыгоды дылетанта».
**13.40** Фільм «Ход канём». СССР, 1962 г.
**15.15** «Ваенная таямніца».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** Фільм «Рыта». Расія, 2010 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** Фільм «Імаджынарыум доктара Парнаса». Вялікабрытанія-ЗША, 2005 г.
**22.30** «Дзіўная справа».
**23.20** Фільм «Дзеткі ў парадку». ЗША, 2010 г.
**01.10** «Глядзець усім!».

**07.40** Дабравест.
**08.05** «Яго батальён» («Беларусьфільм»). 1-я серыя.
**09.25** Пазакласная гадзіна.
**09.45** Тэлебарометр.
**09.50** Камедыйны серыял «Светлафор».
**11.00** Альбарутэнія.
**11.30** Наперад у мінулае.
**12.10** Пад грыфам «Вядомыя».
**12.45** Беларуская кухня.
**13.20** Мюзікл «Марозка» (Украіна).
**15.30** Мазгавы штурм.
**16.05** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Агляд тура.
**17.05** Біятлон. Чэмпіянат свету. Чэмпіянат свету. Эстафета. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**19.15** Ваша лато.
**19.55** Латарэя «Пяцёрачка».
**20.05** Парушаючы запаведзі.
**20.55** Тэлебарометр.
**21.00** КЕНО.
**21.05** «Імперыя песні». Музычна-забаўляльнае караоке-шоў.
**22.10** Мюзікл «Марозка» (Украіна).
**00.00** Крымінальны баявік «Бумер. Фільм другі» (Расія).
**01.55** Камедыйны серыял «Светлафор» (Расія).

**07.00** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**08.40** Фільм «Апошняя ахвяра» (2012 г.).
**10.25** «Ранішняя@пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**12.20** Фільм «Школьны вальс».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Сумленны дэтэктыў». Аўтарская праграма.
**14.50** «Скарбы «Прусіі».
**15.35** «Золата інкаў».
**16.25** Тэлесерыял «Сваты».
**18.25** «Суботні вечар».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.40** Фільм «Вогнішча на снезе» (2012 г.).
**00.00** Фільм «Асабістая справа маёра Баранава» (2012 г.).

**06.30** Вострасюжэтны дэтэктыў «Агент адмысловага прызначэння».
**08.00** Сёння.
**08.20** Агляд.
**08.50** «Гатуем».
**09.25** «Справа густу».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.20** Дэтэктыўны серыял «Версія».
**15.05** «Судовы дэтэктыў».
**16.15** «Следства вялі.».
**17.10** Вострасюжэтны серыял «Адысея шпіка Гурава».
**19.00** Сёння.
**19.25** Вострасюжэтны серыял «Адысея шпіка Гурава».
**21.05** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**22.00** «Ты не паверыш!».
**22.55** «Прамень Святла».
**23.25** «Рэакцыя Васэрмана».
**00.00** Вострасюжэтны фільм «Справа гонару».

**05.00** М/ф «Святло ў акне».
**06.15** М/ф-мы.
**07.40** «Мільён пытанняў пра прыроду».
**07.55** М/с «Смешарыкі».
**08.15** «Эксперыментатары».
**08.30** «Мар! Дзейнічай! Будзь!».
**09.00, 15.00** Навіны Садружнасці.
**09.10** «Зроблена ў СССР».
**09.40, 22.55** Т/с «Дзевяць невядомых».
**15.10** М/ф «Паварот».
**16.25** М/ф «Гарачае сэрца».
**19.20** «Навіны Садружнасці. Культура».
**20.05, 05.10** «Практычная магія».
**20.50** М/ф «Кафэ «Шніцаль Парадыз».
**22.25** «Музычны ілюмінатар».

**07.00** Студыя «Белсат».
**08.30** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**08.55** Аб'ектыў.
**09.20** Студыя «Белсат»: Размова У. Мацкевіча / М. Жбанкова.
**09.40** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**10.10** Кулінарныя падарожжы Робэрта Макловіча.
**10.35** Маю права (юрыдычная праграма).
**11.00** Форум (ток-шоу).
**11.45** Казкі для дзетак: «Цюхця, што ты за стварэнне?!», «Фільм са страшнаю назваю», «Экспедыцыя прафесара Губкі».
**12.15** «Каханне ля поплаву», тэлесерыял: 7 серыя.
**13.00** «Час гонару», серыял: 8 серыя.
**13.50** МакраФон: «Рок па вакацыях–2008».
**14.35** Без рэтушы: «Маланка аркестр», рэпартаж, 2012 г., Беларусь.
**14.50** «Сенсацыі ХХ стагоддзя», серыял: «Аперацыя «Берлін-45».
**15.45** «Маё жыццё для Яго», дак. фільм, 2004 г., Польшча.
**16.40** «Аповеды выходнага дня», цыкл маст. фільмаў, 1996–2000 гг., Польшча: «Лінія затрымання», 1997 г.
**17.35** «Калі сэрца ў чаканні», серыял: 7 серыя.
**18.00** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**18.30** Назад у будучыню (гістарычная праграма).
**18.45** Калыханка для самых маленькіх.
**18.55** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.10** «Ваенныя гульні», дак. фільм, 2009 г., Польшча 4 серыя.
**20.00** Зона «Свабоды» (аналітычная праграма).
**20.30** Відзьмо-невідзьмо (інфармацыйна-забаўляльны агляд): выд. 18.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Невядомая Беларусь: «Цень манументу», дак. фільм, 2012 г., Беларусь.
**21.45** Суботні сеанс: «Далёка ад акна», маст. фільм, 2000 г., Польшча.
**23.45** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**00.10** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**00.25** Жаўтуха (сатырычная праграма).

ГЕАПАЛІТЫКА

# КАТАЛОНСКАЯ ІМПЕРЫЯ

Алег НОВІКАЎ

**Нават магчымае абвяшчэнне незалежнасці Каталоніі не здыме каталонскае пытанне з павесткі дня, паколькі каталонцы маюць сур'ёзныя тэрытарыяльныя прэтэнзіі да краін-суседак.**




Той, хто бачыў па каталонскіх публічных каналах мясцовы прагноз надвор'я, дакладна адзначыў парадаксальную на першы погляд акалічнасць. Распавядаючы пра рознага кшталту цыклоны і атмасферныя ціскі, метэаролаг водзіць указкай не толькі па мапе Каталоніі, аднак і па суседніх рэгіёнах — Валенсіі, Балеарскіх астравах, поўдні Францыі… Справа ў тым, што ў каталонскім грамадстве папулярныя забабоны, што гэтыя землі, а таксама Андора і горад Альгера, што ў італьянскай Сардзініі, належаць да так званай «comunidad catalánica» (каталонская супольнасць), якая несправядліва была падзеленая паміж Парыжам, Рымам і Мадрыдам.

«Імперская» каталонская канцэпцыя, або pancatalanismo, нарадзілася напрыканцы XIX стагоддзя і будавалася на тэзісе пра тое, што ўсе, хто размаўляе пакаталонску, маюць каталонскую нацыянальную ідэнтычнасць і, адпаведна, павінна быць складнікамі аднаго дзяржаўнага фармавання Países Catalanes. Прыкладнымі межамі гэтай дзяржавы лічыліся кардоны сярэднявечнага Арагонскага Каралеўства, якое на этапе росквіту ўключала Сіцылію, Корсіку, Неапаль і г.д. Каталонскія патрыёты лічаць тую эпоху залатым часам сваёй гісторыі, хаця каталонская мова, хоць і была сапраўды вельмі распаўсюджанай, не мела статусу дзяржаўнай. Справаводства ў каралеўстве вялося на лацінскай або на іспанскай мовах.

Формула pancatalanismo была прыдуманая ў час, калі нацыяналісты па ўсёй Еўропе, як правіла, былі рамантыкамі. Наступная генерацыя нацыяналістаў стала больш прагматычнай і геапалітычнымі пражэктамі такога кшталту мала цікавілася. Прынамсі, калі Каталонія атрымала аўтаномію ў рамках Іспанскай Рэспублікі. Генералітэт (Generalitat — так называюць каталонскі ўрад) яе межы ніколі не аспрэчваў.

Канцэпцыя Вялікай Каталоніі адрадзілася ў 1960-я гады і дасягнула зеніту сваёй папулярнасці ў 1970-я, калі фінал дыктатуры Франка быў відавочны. Каталонская апазіцыя, рыхтуючыся да глабальных перамен, сфармулявала праграму: дамагацца не толькі рэстаўрацыі аўтаноміі Каталоніі, аднак максімальна пашырыць у рэгіёнах, якія ўваходзяць у зону comunidad catalánica, тэорыю Países Catalanes. У 1977 годзе ў рэзалюцыі Кангрэс каталонскай культуры заклікаў да барацьбы за Países Catalanes, якім даў наступную дэфініцыю — «культурная супольнасць, што развілася на працягу тысячы гадоў і стварыла гамагенную базу для жадання сумеснага жыцця ў будучым».

Задуманае на тым кангрэсе ўдалося рэалізаваць часткова. Пры Generalitat даўно існуе дэпартамент, які працуе з суайчыннікамі і займаецца папулярызацыя каталонскай культуры ў арэале Países Catalanes. На цяперашні дзень практычна ва ўсіх рэгіёнах патэнцыяльнай Países Catalanes каталонская мова прызнаная як афіцыйная. Аднак з палітычнымі патрабаваннямі гэта не рэзаніруе.

Сёння пункт пра неабходнасць рэвізіі межаў Каталоніі можна знайсці ў палітычных праграмах некаторых каталонскіх партый. Найбольш буйная з іх — Рэспубліканская Левая Каталоніі (ERC), якая мае другую па колькасці фракцыю ў рэгіянальным парламенце. Па-за межамі Каталоніі за стварэнне Países Catalanes выступае Сацыялістычная партыя Мальёркі (PSM), якая да 2011 года ўваходзіла ў склад ураду Балеарскіх астравоў. Праўда, гэта хутчэй выключэнне з правілі. На апошніх выбарах у той частцы Францыі, дзе кампактна пражываюць каталонцы, пракаталонская партыя атрымала 93 галасы.

Зразумела, што не ўсе жыхары рэгіёнаў, якія ўключылі ў склад Países Catalanes, у захапленні ад такой перспектывы. Перш за ўсё, гаворка пра тых грамадзян, якія па розных прычынах не жадаюць распаду Іспаніі. Да таго ж у самой Іспаніі існуе цэлая плеяда публіцыстаў і гісторыкаў, якія актыўна змагаюцца супраць догматаў pancatalanismo. Напрыклад, атакуюць міф пра каталонскі нацыянальна-культурны складнік Арагонскага Каралеўства, звяртаючы ўвагу на тое, што Каталонія ў складзе гэтай дзяржавы першапачаткова называлася «Іспанская марка».

Можна пагадзіцца з адным з мадрыдскіх журналістаў, які сцвярджае, што «праект pancatalanismo мала адпавядае рэальнасці, сацыяльным запытам і інтарэсам лакальных элітаў па-за межамі Каталоніі».

Аднак ёсць іншы бок. Pancatalanismo выклікаў цікавыя рухі ў краях, на які паклалі вока яго адэпты. Адчуваючы комплекс непаўнавартаснасці перад каталонцамі, тубыльцы пачыналі працэс будаўніцтва сваёй ідэнтычнасці.

Так, у суседняй камуне Валенсія менавіта праз нежаданне падпарадкавацца Барселоне ўзнік феномен blaverismo (назва руху паходзіць ад блакітнага колеру аднаго з гістарычных сцягоў правінцыі, на мове тубыльцаў «blava»). Блакітны сцяг тутэйшыя разглядалі як альтэрнатыву сцягу Валенсіі, пабудаванаму на аснове дызайну каталонскага сцяга.

**Запланаванае абвяшчэнне незалежнасці Каталоніі ў 2014 годзе можа рэанімаваць пакуль віртуальны праект стварэння Вялікай Каталоніі**




Blaverismo нарадзіўся падчас пераходу Іспаніі да дэмакратыі менавіта як рэакцыя на экспансію панкаталонскіх канцэпцый. У адказ частка мясцовай левай інтэлігенцыі мабілізавалася супраць уключэння ў сферу ўплыву Каталоніі — выступілі за прызнанне валенсійскага дыялекту асобнай мовай (гэтая кампанія атрымала назву «Моўная вайна»). Яны разгарнулі дэбаты вакол мясцовай сімволікі, патрабавалі стварэння паўнавартаснай аўтаноміі Валенсійскі край (па цяперашній канстытуцыі, рэгіён мае статус камуны). У 1977 годзе нават была створаная тэрарыстычная «Група валенсійскага дзеяння» (GAV), якая пагражала тым, хто занадта горача прапагандуе ідэю інкарпарацыі Валенсіі ў склад Вялікай Каталоніі.

Нягледзячы на невялікі актыў, аматары blaverismo дабіліся шмат чаго: пачынаючы рэформай геральдыкі па сваіх эскізах і заканчваючы абвяшчэннем у 2005 годзе валенсійскага дыялекту асобнай мовай.

Праўда, канчаткова перамагчы ў культурнай вайне ім не ўдалося. Валенсійскі нацыяналізм разглядае сябе хутчэй як рэгіянальны (foralismo), а не незалежніцкі рух. Прынамсі, з такіх пазіцый выступае самая буйная мясцовая партыя «Валенсійскі саюз», які мае каля 10 працэнтаў у парламенце камуны. З іншага боку, у цяперашняй дыскусіі вакол неабходнасці пашырэння правоў камун і аўтаномій, некаторыя секцыі «Валенсійскага саюзу» ўпершыню выступілі за ператварэнне Іспаніі ў федэрацыю і наданне Валенсіі статусу суб'екта, роўнага з іншымі. Як бачым, pancatalanismo стаў імпульсам станаўлення новых этнасаў і, адпаведна, новых сепаратысцкіх рухаў, што фактычна на руку каталонскім незалежнікам.

Акрамя таго, запланаванае абвяшчэнне незалежнасці Каталоніі ў 2014 годзе можа рэанімаваць пакуль віртуальны праект Вялікай Каталоніі. Так, выданне «Financial Times» прагназуе, што незалежная Каталонія можа стаць самай заможнай краінай паўднёвай Еўропы, што, відавочна, будзе спрыяць выбуху пачуцця каталонскай самасвядомасці ў рэгіёнах, якія адносяцца да Países Catalanes.

## ЯНЫ ПРА НАС. ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Кожны беларускі гастарбайтэр на расійскай зямлі з'яўляецца бачным і цалкам адушаўлёным сведчаннем поўнага правалу беларускага шляху развіцця, міфа пра Бацьку Лукашэнка. У сталіцы рэспублікі спыняюцца будоўлі, таму што будаўнікі бягуць брыгадамі. Варта нагадаць, што краіна, якая з'яўляецца экспарцёрам рабочай сілы, цалкам страчана для сістэмных інвестыцый. У лепшым выпадку, у ёй адкрыюць філіялы буйныя замежныя рэкруцкія фірмы. Ці разумеюць беларускія ўлады маштаб пагрозы? Уважлівае назіранне за рэакцыяй кіраўніцтва рэспублікі дазваляе лічыць, што разумеюць толькі часткова. Аўтарытарная мадэрнізацыя і дзяржаўная прапагандысцкая кампанія супраць гастарбайтэраў — прыклад такога частковага разумення праблемы.

**«Politoboz» (Расія)**

Пасля актыўнай барацьбы з бізнэсам у 1990-х гадах, у нулявыя сітуацыя больш-менш супакоілася. Астатнія бізнэсмэны аддавалі перавагу тактыцы — не высоўваца, не гаварыць лішняга і ўладу не крытыкаваць. Але дзесьці паўтара гады таму Лукашэнка ціха, «без абвяшчэння вайны» пачаў канчатковую зачыстку: улады ўзяліся за ветэранаў беларускага бізнэсу — тых, хто зарабіў капітал у 1990-х і не дэманстраваў лаяльнасці рэжыму, але раней не прыцягваў увагі прэзідэнта напросту з-за невялікіх маштабаў сваёй дзейнасці.

**«Деловые ведомости» (Эстонія)**

У саюзнікаў Масквы па Трайным саюзе прынцыпова рознае стаўленне да інтэграцыі і прынцыпова розныя інтарэсы. Для Лукашэнкі альянс з Масквой і Астаной — спосаб бясконцага выбівання субсідый з расійскага бюджэту. Атрымаўшы ў антыкрызісным фондзе ЕўрАзЭС крэдыт у два з лішнім мільярды долараў, Лукашэнка тут жа абвясціў ЕўрАзЭС «пройдзеным этапам у інтэграцыі» і адмовіўся плаціць у гэту арганізацыю сяброўскія ўнёскі. У 2012 годзе ўнёсак Мінска ў бюджэт ЕўрАзЭС па спецыяльным распараджэнні Пуціна быў пагашаны са сродкаў расійскай казны. Не вельмі карэктныя паводзіны ў адносінах да саюзніка, ці не так? Але дасведчаны беларускі Бацька ведае, як супакоіць праведны гнеў расійскага мядзведзя: наш мядзведзь любіць вушамі.

**«Московский Комсомолец» (Расія)**

Прэзідэнт Беларусі ў сваёй заяве таксама адзначыў, што праз два гады сістэму беларускай аховы здароўя чакае сур'ёзная рэформа. Яна прадугледжвае ў тым ліку і павышэнне сярэдняй заработнай платы работнікам аховы здароўя. Аднак скептыкі ўжо даюць прагноз, што за два гады інфляцыя абясцэніць абяцаныя медыкам надбаўкі да зарплаты.

**«Голос России» (Расія)**

Заява Назарбаева пра тое, што «Казахстан будзе выходзіць з міждзяржаўных арганізацый, калі яны пагражаюць яго незалежнасці», цалкам выразна тлумачыць, да якога часу гэтая інтэграцыя будзе развівацца. Калі пагадзіцца з формулай аб саюзе аўтарытарных кіраўнікоў, то можна зразумець, што ні адзін з удзельнікаў аб'яднання не збіраецца станавіцца васалам іншага — і ў гэтым сваім сцвярджэнні Назарбаеў можа цалкам разлічваць на падтрымку прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі.

**«Главред» (Украіна)**

У Беларусі практычна няма законнай магчымасці мець іншае ад урада меркаванне. Апазіцыянерам даводзіцца збірацца таемна на кватэрах. Між тым, у краіне ёсць і новая эліта — актыўныя людзі, якія выказваюць сваё меркаванне, аднак развіваецца гэта сітуацыя вельмі павольна.

**«Die Zeit» (Германія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### УРУГВАЙ. ФАЛЬКЛЕНДЫ — СПРАДВЕЧНАЯ ЎРУГВАЙСКАЯ ЗЯМЛЯ

Канфлікт вакол прыналежнасці Фальклендскіх (Мальвінскіх) астравоў набыў новае незвычайнае вымярэнне. Цяпер акрамя Вялікабрытаніі і Аргенціны на яго прэтэндуюць уругвайцы. Ва Уругваі выйшла кніга «Па закону астравы належаць нам», аўтары якой патрабуюць устанаўлення над архіпелагам улады гэтай дзяржавы. Свае прэтэнзіі на тэрыторыю Фальклендаў уругвайцы будуюць на факце таго, што Іспанія афіцыйна адмовілася ад Фальклендаў, якія фармальна ўваходзілі ў склад яе імперыі, толькі ў 1841 годзе. Прычым зрабіла яна гэта ў дамове з Уругваем, а не з Аргенцінай. Іншымі словамі, передала кантроль над сваімі марскімі калоніямі ў Паўднёвай Атлантыцы ўругвайцам. Аналагічная дамова з Аргенцінай была заключаная Мадрыдам толькі праз 7 гадоў. Такім чынам, Уругвай мае ўсе правы ў гэтым пытанні. Больш таго, у 1972 годзе адна з дыпламатычных канферэнцый прызнала, што Уругвай, а не Аргенціна стаў першым законным уладальнікам астравоў пасля таго, як былая каланіяльная метраполія адмовілася ад зямель. У сувязі з гэтым аўтары кнігі таксама заклікаюць урад краіны выставіць патрабаванні да Лондану і Буэнас-Айрэсу наконт сваіх правоў на Фальклендаы (Мальвіны). Самі ўругвайскія палітыкі ў шоку ад такой навіны.

**Паводле брытанскай прэсы**



### УКРАІНА. ЧАМУ ДЭПАРДЗЬЕ НЕ СТАЎ УКРАІНЦАМ

Эпапея з расійскім грамадзянствам Жэрара Дэпардзье атрымала ва Украіне свае незвычайныя водгукі. Шмат хто не можа зразумець, чаму акцёр не папрасіў украінскае грамадзянства. Раней ён часта выказваў сімпатыі на адрас Украіны — падтрымаў аранжавую рэвалюцыю, намагаўся інвеставаць у вінную вытворчасць у Крыме і г.д. Улада абвінаваціла ў гэтым Юшчанку, які, быццам, не даў французу тое, чаго ён хацеў. Апазіцыя, у сваю чаргу, кажа, што акцёр перапужаўся аўтарытарнага рэжыму Януковіча, які дазваляе спецслужбам іншых краін працаваць ва Украіне. Так, нядаўна ФСБ выкрала ў Кіеве расійскага апазіцыянера, які праходзіў па справе вулічных беспарадкаў. Між тым, самыя радыкальныя апазіцыянеры з партыі «Свабода» заклікалі ўкраінцаў байкатаваць фільмы з удзелам «маскаля» Жэрара Дэпардзье. Аднак праблема выяўляецца больш маштабнай: аказваецца, за 21 год украінскай незалежнасці ўкраінскае грамадзянства атрымлівалі толькі футбалісты і бізнэсмэны.

**Паводле ўкраінскай прэсы**

### АЎСТРЫЯ. МУСУЛЬМАНЕ ПАТРАБУЮЦЬ КАНФЕРЭНЦЫІ ПА ЦАЦКАХ

Шмат хто памятае нядаўнюю заяву Саюза туркаў Аўстрыі, якія ўбачылі ў дзіцячай цаццы «Lego», дзе выяўлены палац адмоўнага персанажа Джаба з серыялу «Зорныя войны», прыкметы распальвання нянавісці да ісламу. Туркі лічаць, што цацачны будынак нагадвае Сафійскі сабор у Стамбуле, у вартаўнічай вежы яны ўгледзелі мінарэт, а ў варце са зброяй — муэдзіна. Адпаведна, вернікі лічаць цацку непрымальнай, бо яна, па іх меркаванні, фармуе ў свядомасці дзяцей уяўленне пра мусульман як пра тэрарыстаў. На гэтым, аднак, турэцкія актывісты не спыніліся. Згаданая арганізацыя заклікала Еўрасаюз правесці еўрапейскую канферэнцыю па пытаннях палітычна карэктных цацак, якая б выпрацавала новыя прынцыпы працы гэтай індустрыі. На думку аўтараў заклюку, у выніку з канвеера будуць сыходзіць цацкі без ксенафобскага падтэксту, што пазбавіць грамадства ад з'яўлення сацыяпатаў, тэрарыстаў, фанатыкаў і г.д. Турэцкая грамада ў Аўстрыі таксама патрабуе, каб вытворцаў цацак, з якімі ў дзяцінстве гулялі будучыя злачынцы і тэрарысты, таксама можна было прыцягваць да крымінальнай адказнасці.

**Паводле аўстрыйскай прэсы**

### РАСІЯ. ВЫБАРШЧЫКАМ БУДУЦЬ ВЫДАВАЦЬ КНІГІ ДЛЯ ГАЛАСАВАННЯ

Расійскія парламентары разважаюць пра тое, як павінен выглядаць новы выбарчы бюлетэнь. Справа ў тым, што колькасць зарэгістраваных партый у краіне за апошні год вырасла з сямі да паўсотні. Прыходзіцца думаць, як будзе выглядаць новы дакумент для галасавання. Першае пасяджэнне на гэты конт прайшло ў адным з камітэтаў Дзяржрумы. Варыянтаў прапанавана шмат. Напрыклад, друкаваць бюлетэні ў форме маленькіх кніжак. Выбаршчык падчас галасавання будзе проста вырываць старонку з назвай партыі і кідаць яе ў скрыню. Самы экзатычны варыянт прапанаваў адзінарос Аляксандр Сідзякін: даваць выбаршчыку ліст, на якім замест назваў партый будуць іх сімвалы. Напрыклад, мядзведзь будзе значыць спіс «Адзінай Расіі», серп і молат — камуністаў, сокал — ліберал-дэмакраты Жырыноўскага і г.д. Сідзякін пры гэтым згадаў ЗША, дзе ўсе ведаюць, што слон — гэта рэспубліканцы, а асёл — дэмакраты. Аднак большасць прадстаўнікоў партый гэтай прапановы не зразумелі. Таму ЦВК схіляецца да думкі проста размясціць на аркушы лічбы, які будуць значыць нумар партыйнага спісу. Аднак усе баяцца, што электарат заблытаецца ў гэтай арыфметыцы. Між тым, ЦВК патрабуе, каб з формай выбарчага дакумента вызначыліся да 30 мая. Інакш кантора не паспее падрыхтавацца да выбаў у верасні.

**Паводле расійскай прэсы**

▸ МЕРКАВАННЕ

# ПРАКЛЁН МАЦІ САЛДАТА

**У Казахстане здарылася серыя загадкавых смярцяў прадстаўнікоў спецслужбаў. Насельніцтва звязвае іх з праклёнам, які маці асуджанага радавога Уладзіслава Чэлаха наклала на суд. Пра падрабязнасці працэсу і пра тое, чаму казахскае грамадства стала верыць у забабоны, журналіст НЧ Алег Новікаў размаўляе з казахскім праваабаронцам Андрэем Грышыным.**



***— 30 мая мінулага года ў СМІ з'явілася шакуючая навіна: на заставе «Арканкерген», што каля Алма-Аты, адбылося ЧП. Знойдзены абгарэлыя парэшткі 14 чалавек, у тым ліку труп егера. Якія версіі адпрацоўвала следства?***

— У ліку першых версій таго, што здарылася, быў напад на заставу з мэтай захопу зброі. Аднак пазней улады заявілі, што зброю знайшлі на тэрыторыі заставы. Разглядалі версію пра тое, што злачынства магло быць здзейснена і на глебе нестатутных адносін. У выніку стрэлачнікам стаў 19-гадовы Уладзіслаў Чэлах, які збег з заставы і праз нейкі час здаўся ўладам. Ён прызнаўся ў забойстве 14 сваіх калегаў. Гэтае пакаянне адразу пракруцілі па ўсіх афіцыйных СМІ, назваўшы ўчынак Чэлаха праявай сіндрому Брэйвіка. Трэба сказаць, што ў вінаватасць Уладзіслава не верылі ні яго сваякі, ні многія грамадскія дзеячы, ні нават журналісты. У 19-гадовага хлопца ў руках быў пісталет камандзіра. Гэтым пісталетам ён страляе ў 15 чалавек. А што робіць іншыя 14, калі ён страляе ў першага? Тлумачэнне следства проста смешна чытаць: «Калегі Чэлаха пры накіраванні на іх зброі ўспрымалі гэта несур'ёзна».

***— Ці былі альтэрнатыўныя версіі з боку незалежных журналістаў?***

— Вельмі шмат. Пачнём з самых экзатычных. Вядомы сваёй жаўцізной канал «Рэн ТБ» увогуле зняў фільм пра тое, што казахскіх пamежнікаў забілі іншапланецяне. Праўда, матывы іх злачынства канал не раскрыў.

Калі сур'ёзна, шмат хто палічыў, што галоўная праблема — грошы. Праз мяжу з Кітаем праходзіць кантрабанда. Заплаці памежнікам — і табе «зялёнае святло». Хутчэй за ўсё, чакалася пастаўка буйнога грузу, але генералы казахстанскай мытні не дамовіліся з кантрабандыстамі.

Мае права на існаванне версія пра тое, што забойства звязанае з пляменнікам Назарбаева, які фліртуе з ісламістамі. Быццам ён выкарыстоўваў заставу як яўку для сваіх сяброў, якія ўступілі ў канфлікт з вайскоўцамі. У гэтым плане цікавыя словы Нурсултана Назарбаева, які насуперак афіцыйнай версіі пра Чэлаха нечакана ляпнуў: тое, што адбылося на заставе, «было актам тэрарызму, які адбыўся ў выніку ўнутраных канфліктаў».

Яшчэ адна версія звязаная з месцам знаходжання заставы. Яна стаіць побач з генеральскімі дачамі і дарагімі турбазамі, дзе адпачываюць бонзы казахскага рэжыму. Фактычна, памежны атрад выконваў функцыі аховы і мог папросту трапіць у нейкую п'яную разборку паміж гасцямі. Аматары гэтай версіі спасылаюцца на плёткі, паводле якіх каля заставы былі знойдзеныя трупы жанчын.

***— Як вядома, Уладзіслаў Чэлах падчас працэсу адмовіўся ад папярэдніх паказанняў. Што ён сам распавядае наконт падзей на заставе?***

— Так, падчас суду Чэлах прызнаўся, што нікога не забіваў, а следства на яго псіхалагічна ціснула: былі пагрозы арганізаваць згвалтаванне, абяцанні, што калі ён прызнаецца, то яму дапамогуць, што яму не дадуць пажыццёвае зняволенне і г.д. Па яго словах, на памежную заставу «Арканкерген» быў здзейснены напад. Аднак поўнай інфармацыі публіка ад яго так не дабілася. Ёсць думка, што ў турме салдата моцна катавалі. Пра гэта сведчыць хаця б тое, што ўпершыню ён сустрэўся з адвакатам толькі праз даволі працяглы час пасля арышту. Таксама вядома, што ў турме Чэлах спрабаваў учыніць самагубства.

**Выходзячы з залы суда, Святлана Вашчанка (маці асуджанага) кінула ў дзяржабвінаваўцаў жменю маку і сказала: «Гніць вам да канца жыцця свайго»**

***— Адкуль узялася байка пра праклён маці Чэлаха?***

— 11 снежня 2012 года суд прызнаў памежніка Чэлаха вінаватым ў забойстве 15 чалавек і прысудзіў яго да пажыццёвага зняволення. Выходзячы з залы суда, Святлана Вашчанка (маці асуджанага) кінула ў дзяржабвінаваўцаў жменю маку і сказала: «Гніць вам да канца жыцця свайго». Паводле яе слоў, мак быў загавораны.

Гэты выпадак стаў вельмі вядомым у грамадстве, якое сачыла за працэсам і, як правіла, спачувала асуджанаму і яго сям'і. Спачатку пра гэта пісалі як пра кур'ёз. Аднак стаўленне да слоў маці змянілася, як толькі пачалася серыя дзіўных трагедый, звязаных з супрацоўнікамі памежнага ведамства: спачатку ў снежні разбіўся самалёт з кіраўніцтвам службы, прычым распавядаюць, што аднаму з генералаў напярэдадні прысніўся дзіўны сон, і ён доўга адмаўляўся садзіцца на борт. Пасля 31 студзеня гэтага года ў сваім кабінеце быў знойдзены мёртвым дырэктар Акадэміі памежнай службы генерал-маёр Есепаў. А 4 лютага паканчыў з жыццём Мурат Кадралінаў, намеснік начальніка адной з памежных застаў. Афіцыйныя паведамленні пра ўсе выпадкі даволі скупыя. Так, самагубства Кадралінава, быццам, адбылося «на глебе сямейнай спрэчкі».

Відавочна, публіку такімі заявамі ўжо не пераканаць. Тэма пра кару нябесную настолькі папулярная, што кіраўнік Камітэта нацыянальнай бяспекі Казахстана Нуртай Абыкаеў публічна аспрэчыў містычную сувязь паміж авіяцыйнай катастрофай і падзеямі на судзе.

***— Ці можна зрабіць глабальныя высновы з гэтай незвычайна гісторыі?***

— Па-першае, яна не закончаная, паколькі адвакат падаў апеляцыю, якую зараз разглядаюць. Увогуле, трэба быць вялікім фанатыкам містыцызму, каб паверыць у сувязь паміж учынкам маці Чэлаха і апошнімі падзеямі. Хаця б таму, што яе праклён быў адрасаваны суддзям і пракурору, а не памежнікам. Калі апусціць версію пра выпадковасць катастрофы і самазабойстваў, то, магчыма, гэта ліквідацыя сведак. На думку шэрагу экспертаў, сыход з жыцця афіцэраў, гібель кіраўніка памежнай службы Казахстана ў снежаньскай авіякатастрофе і масавая бойня на заставе «Арканкерген» года могуць быць узаемазвязаны. Як бы тое ні было, папулярнасць версіі пра праклён добра сведчыць: казахі ў пошуках справядлівасці больш спадзяюцца на духаў, чым на Назарбаеўскую Феміду, што крамольна кажа пра давер людзей да ўсёй сістэмы.

ЦІКАВА

# ІНДЗЕЙЦЫ ЯШЧЭ ЗДОЛЬНЫЯ НА СУПРАЦІЎ

Алег НОВІКАЎ

**40 гадоў таму адбылася апошняя спроба індзейцаў ЗША са зброяй у руках дабіцца прызнання сваіх правоў. Адным з наступстваў радыкалізацыі руху за правы карэнных амерыканцаў стала з'яўленне так званага антыіндзейскага руху.**



27 лютага 1973 года паселішча Вундэд-Ні (Параненае калена), што знаходзіцца ў рэзервацыі Пайн-Рыж (штат Паўднёвая Дакота) і налічвае 40 жыхароў, было захоплена паслядоўнікамі Руху амерыканскіх індзейцаў (AIM). Месца для вылазкі было абранае невыпадкова. Менавіта тут у 1890 годзе адбылася жудасная бойня індзейцаў племені сіу амерыканскімі войскамі. Жаўнеры калолі дзяцей штыкамі, выразалі ў забітых палавыя органы для тытунёвых кісетаў...

Бунт у Вундэд-Ні ў 1973 годзе закончыўся 8 мая, прычым дастаткова мірна. Пры пасярэдніцтве пратэстанцкай царквы была падпісаная мірная дамова. Белы дом пагадзіўся разгледзець абвінавачванні супраць племяннога савета ў карупцыі, а таксама ўзняць дакументы наконт прыналежнасці індзейцам некаторых зямель.

Амерыка ўздыхнула з палёгкай. Падчас канфлікту прэса ахвотна пісала пра тое, што краіна стаіць на парозе новых індзейскіх войнаў. Яшчэ больш пужала абывацеля перспектыва саюзу паміж індзейцамі і набіраючым моц рухам за правы афраамерыканцаў, радыкальная фракцыя якога не адмаўляла варыянту ўзброенага супраціву.

Аднак самым нечаканым наступствам падзей у Вундэд-Ні стала фармаванне ў ЗША арганізаванага руху супраць індзейцаў. Гэта дастаткова цікавы і малавядомы ў нас феномен. Менавіта ў 1970-я гады аформілася палітычная плынь, якая выступае за канчатковую ліквідацыю індзейскіх аўтаноміі ў выглядзе рэзервацый і інтэграцыю ўсіх індзейцаў у амерыканскі шматнацыянальны соцыум.

Існаваў цэлы набор аб'ектыўных прычын адраджэння сярод белых амерыканцаў антыіндзейскіх забабонаў. Перш за ўсё, трэба ўгадаць культ амерыканскага ладу жыцця, які панаваў у ЗША ў 1940–1950-я гады. Агрэсіўная філасофія спажывання супярэчыла індзейскаму светапогляду, што знайшло выяўленне ў тагачасных вестэрнах, дзе індзейцы — спрэс негатыўныя персанажы. Тады ж узнік амерыканскі аналаг нашых анекдотаў пра чукчаў, дзе «чукчамі», зразумела, былі рознага кшталту апачы, сіу, каманчы і іншыя.

Паступова сфармаваўся міф пра тое, што цывілізацыя індзейцаў недаразвітая і не здольная наладзіць эфектыўную адміністратыўна-гаспадарчую мадэль. Індзейцаў пачалі выяўляць як сацыяльных паразітаў, якія цягнуць з бюджэту датацыі. Быў ужыты цікавы тэзіс пра тое, што фінансаванне рэзервацый кансервуе расізм, паколькі льготы ў дадзеным выпадку даюцца па прынцыпу колеру скуры.

Таму няма нічога дзіўнага, што антыіндзейскія лозунгі ўзялі на ўзбраенне радыкальныя кансерватары і белыя расісты. У 1970-я гады на Захадзе часта матывацыяй для стварэння атрадаў міліцыі стала віртуальная пагроза п'яных індзейцаў (алкагалізм у рэзервацыях зашкальваў як следства павальнага беспрацоўя). Заклік пра тое, што «хопіць карміць індзейцаў», ахвотна ўжываўся падчас выбарчых кампаній кансерватыўных палітыкаў.

Аднак, як не дзіўна, піянерамі антыіндзейскага руху былі аматары прыроды. У 1960-я гады ў штаце Вашынгтон прыхільнікі спартыўнай лоўлі фарэлі стварылі грамадзянскую ініцыятыву супраць практыкі лоўлі рыбы з дапамогай сетак, як гэта, адпаведна старадаўняй традыцыі, рабілі мясцовыя індзейцы. Так узнікла Асацыяцыя абароны фарэлі, сябры якой пачалі атакаваць індзейцаў-рыбакоў. Такія групы сталі вельмі папулярныя ў 1980-я гады. Цікава, што часта індзейцаў і эколагаў мірыла з'яўленне ў акрузе нейкага прамысловага гіганта, чыя прысутнасць пагражала той жа фарэлі ў значна большым маштабе.

Натуральна, вялікую ролю ў канфлікце адыграла зямельнае пытанне. Буйныя карпарацыі шукалі шляхі эксплуатацыі рэсурсаў на тэрыторыі рэзервацый. У юрыдычным плане гэта была вельмі складаная рэч, паколькі зямельныя адносіны з індзейцамі павінны былі рэгуляваць на аснове закона аб рэарганізацыі індзейцаў, які быў прыняты ў 1934 годзе і забараняў савету племені заключаць зямельныя кантракты без згоды большасці сяброў клану. Адсюль з'явіліся заклікі прызнаць несапраўднымі ўсе дамовы, якія амерыканскі ўрад заключаў з індзейцамі падчас каланізацыі Захаду, а іх землі зрабіць звычайным аб'ектам куплі-продажу.

Увогуле, сама сістэма асобнай юрысдыкцыі на індзейскіх тэрыторыях выклікала крытыку з боку часткі юрыстаў правых поглядаў. Паводле згаданага вышэй Закону аб рэарганізацыі, хаця індзейскія арэалы знаходзяцца на тэрыторыі ЗША, грамадзяне ЗША (калі яны не індзейцы), прыжываючы тут, не маюць права абіраць мясцовыя судовыя і адміністратыўныя органы.

Так узнік тэрмін «чырвоны апартэід». У 1970-я гады быў заснаваны «Альянс за роўныя правы грамадзян» (CERA), які паслядоўна патрабуе ліквідацыі індзейскай прававой аўтаноміі. Гэта дастаткова актыўная групоўка, ідэолагі якой сцвярджаюць, што адзіным выхадам індзейцаў з беднасці можа быць ліберальная эканамічная трансфармацыя ў рэзервацыях, якая немагчымая без ліквідацыі такога анахранізму, як прававая аўтаномія.

Апошнія часы не паменшылі лагер ненавіснікаў індзейцаў. Узніклі новыя экзатычныя фракцыі. Напрыклад, моцна ненавідзяць індзейцаў рух супраць азартных гульняў (з 1988 года індзейцы маюць эксклюзіўнае права арганізоўваць на сваіх землях казіно).

Прыходзяць звесткі пра разборкі паміж індзейцамі і аматарамі неапаганскіх культаў New Age, якія выкарыстоўваюць сакральныя для індзейцаў месцы для сваіх рытуалаў. Не падабаюцца індзейцам і вылазкі на іх землі турыстаў, што таксама прыводзіць да канфліктаў з турыстычным фірмамі.

Нягледзячы на дастатковую актыўнасць антыіндзейскага руху, нейкіх глабальных змен у статусе рэзервацый пакуль няма. Магчыма, улады проста баяцца чапаць гісторыю і некаторыя прававыя аспекты статусу індзейцаў ЗША. Нават паводле амерыканскага заканадаўства, індзейцы прызнаюцца «залежнымі нацыямі», а нацыям, адпаведна міжнароднаму праву, даюцца дастаткова шырокія правы. Напрыклад, права патрабаваць кампенсацыі за генацыд.

У дадатак рэформа рэзервацый патрабуе адмены закона 1934 года, які надае ўсю ўладу савету старэйшын. Апошнія добра ўпісаныя ў карупцыйныя схемы з тымі ж казіно і вельмі лаяльныя да ўраду. Калі ў 2008 годзе індзейскія актывісты абвясцілі пра стварэнне віртуальнай індзейскай рэспублікі Лакота, правадыры плямёнаў заявілі, што асуджаюць гэты накіраваны супраць ураду ЗША крок.

Іншымі словамі, скарачэнне правоў рэзервацый прывядзе да актывізацыі індзейскай грамадзянскай супольнасці, што Вашынгтону абсалютна не патрэбна. Ну і, нарэшце, ёсць урок Вундэд-Ні, які засведчыў, што індзейцы дасюль здольныя на супраціў.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### БАРБЕЛЬ ХЁН



Адзін з лідараў партыі Зялёных у нямецкім рэгіёне Ніжні Рэйн-Вестфалія імгненна стаў палітыкам нацыянальнага ўзроўню, пасля таго, як апублікаваў у інтэрнэце аб'яву пра вакансію для студэнтаў-практыкантаў падчас сваёй выбарчай кампаніі. Таму, хто пройдзе кастынг, палітык паабяцаў плаціць 4 еўра за гадзіну. Для студэнтаў гэта добрыя грошы. Працаваць пагадзіўся шмат хто. Аднак тут узнікла праблема. Справа ў тым, што Зялёныя ў сваёй праграме да выбараў у Бундэстаг заклалі пункт пра тое, што мінімальная плата ў ФРГ павінна быць не менш 8,5 еўра за гадзіну. Натуральна, пачаўся скандал. У дадатак стала вядома, што патрабаванні да кандыдата эколаг выставіў жорсткія: адказнасць за Facebook, відэа-блог, праца з прэсай і грамадскасцю плюс, натуральна, гатаванне кавы (гэта галоўны абавязак усіх нямецкіх практыкантаў). Лібералы — заўзятыя праціўнікі Зялёных — адразу абвінавацілі апошніх у эксплуатацыі моладзі і папулізме. Сам Барбель кажа, што трэба ўважліва чытаць аб'яву. Там гаворыцца, што студэнт будзе працаваць у рамках навучання. Нават прафсаюзы лічаць, што ў такім фармаце гэта вартая аплата, а федэральны закон увогуле дазваляе нічога не плаціць практыкантам. Дарэчы, так робіць большасць нямецкіх палітыкаў, уключаючы праціўнікаў Зялёных. Таму ў кулуарах Бундэстага нават праціўнікі Зялёных вельмі насцярожана каментуюць скандал вакол Барбеля Хёна. Бо каму ж ахвота плаціць за тое, што яшчэ ўчора было бясплатным.

### ГАДЖЫМЕТ САФАРАЛІЕЎ



Дэпутат Дзяржаўнай думы ад партыі «Адзіная Расія» выказаў свае прапановы ў новы закон Расійскай Федэрацыі аб грамадзянстве, які дазваляе любому былому грамадзяніну СССР атрымаць расійскі пашпарт. Аднак Сафаралієў вырашыў унесці невялікія папраўкі. А менавіта — распаўсюдзіць дзеянне закону на ўсіх выхадцаў з Расійскай імперыі. Адпаведна, калі гэты закон пройдзе, то ўсе нашчадкі былых падданых імперыі — фіны, палякі, маньчжуры і кітайцы, змогуць смела ехаць у Расію па пашпарт. У прынцыпе, сам праект (і Сафаралієў гэтага не хавае) разлічаны на рэпатрыяцыю чэркесаў, якія збеглі ў Турцыю і ў Сірыю падчас расійскай каланізацыі Каўказа. Пакуль чэркесы думаюць над прапановай, сайты рускіх нацыяналістаў пужаюць абывацеляў. «Стагоддзі, праведзеныя на Блізкім Усходзе, ужо паспеліператварыць іх (чэркесаў) хутчэй у турак і арабаў, чым у тых жа каўказцаў. Ды і радыкальныя ісламскія погляды, разам з нянавісцю да рускіх, яны атрымалі з матчыным малаком. Як думаеце, ці шмат часу пройдзе перад тым, як гэтыя «новыя расіяне» разгорнуць зялёныя сцягі джыхаду?» — каментуе адно з выданняў ініцыятыву Сафаралієва.

### КІМ ЧЭН ЫН

Вялікі стратэг (адзін з афіцыйных тытулаў правадыра Паўночнай Карэі) перасварыў паміж сабой кампаніі, якія займаюцца выпускам мабільных тэлефонаў. Усё з-за выпадковага здымку, які трапіў у прэсу на мінулым тыдні. На ім Кім Чэн Ын выяўлены падчас аднаго з пасяджэнняў камітэта абароны КНДР, прысвечанага будучаму запуску ядзернай ракеты, якая, быццам, можа дастаць да ЗША. Побач з ім на стале відаць чорны смартфон, які і стаў прадметам скандалу ў свеце карпарацый. Большасць з тых, хто бачыў фота, адразу пазналі ў гэтым смартфоне мадэль кампаніі Samsung. Вядомая карпарацыя, у сваю чаргу, заявіла, што той тэлефон зроблены іншай кампаніяй. Пасля ў спіс падазраваных трапілі тайваньская фірма HTC і амерыканская iPhone. Апошняя таксама адмовіліся прызнаваць сваё аўтарства. Відавочна, што нікому не патрэбны імідж фірмы, якая сімвалічна звязаная з Пхеньянам, ды яшчэ ў час канфрантацыі, якая мае ўсе шансы закончыцца лакальнай вайной. Яшчэ большая загадка ва ўсёй гэтай гісторыі — нашто паўночнакарэйскаму лідару смартфон, калі ў краіне няма інтэрнэту (праўда, тут існуе свой аналаг інтэрнэту, аднак ён слаба развіты).



ПАЛЕМІКА

# ЗБАЎЛЕННЕ АД БЕЛАРУСКАСЦІ

Ігар МЕЛЬНІКАЎ,
кандыдат гістарычных навук

**150-я ўгодкі паўстання 1863 года выклікалі вялікі ўсплёск цікавасці да гэтай падзеі з боку нашых суседзяў. Аднак у самой Беларусі адбываюцца падзеі, якія можна назваць «гістарычным бяспамяцтвам». Сітуацыя ўскладняецца яшчэ і тым, што ў юбілейны год у Беларусі актывізавалі сваю русіфікатарскую дзейнасць прадстаўнікі заходнерускай ідэалогіі і вялікадзяржаўнага шавінізму. Яны праводзяць канферэнцыі, тыражуюць публікацыі ідэалагічнай накіраванасці. Адна з такіх нядаўна была апублікавана на сайце Беларускага тэлеграфнага агенцтва і належыць аўтарству Вадзіма Гігіна.**



Кастусь Каліноўскі




Мапа, якой карысталіся паўстанцы

## І Рэч Паспалітая — не Польшча

У артыкуле рэдактар часопіса «Беларуская думка» спрабуе падмяніць паняцце «Рэч Паспалітая» паняццем «Польшча». Дарэчы, гэта старая хвароба шматлікіх расійскіх і некаторых польскіх даследчыкаў. Аднак варта разумець, што І Рэч Паспалітая, якая спыніла сваё існаванне ў выніку трох падзелаў, не была нацыянальнай польскай дзяржавай у сучасным сэнсе гэтага слова.

Нават нягледзячы на паланізацыю эліт гістарычнай Літвы, ВКЛ не стала Польшчай. Да канца XVIII стагоддзя ў гістарычнай Літве дзейнічаў свабодны, выбарны заканадаўчы орган — Галоўны З'езд (Вальны Сойм), працаваў юрыдычна незалежны ўрад і мясцовая адміністрацыя, была свая ўстанова замежных справаў — Дзяржаўная Канцылярыя, існавала самастойная фінансавая і эканамічная палітыка, уласны дзяржаўны скарб, асобныя карныя структуры, войска, свая сістэма ганаровых званняў і пасадаў. Нарэшце, у ВКЛ дзейнічалі ўласны закон — Статут, які быў юрыдычным падмуркам незалежнасці нашай старажытнай дзяржавы.

## Русіфікацыя

Аналізуючы падзеі паўстання 1863 года на Беларусі, Гігін ні слова не гаворыць пра фактар русіфікацыі, які ўзмацніўся на Беларусі пасля ўзброенага выступлення 1863 года. Беларускі гісторык Леанід Лыч так характарызуе тую сітуацыю: «Факт паўстання царскія ўлады выкарысталі для ўзмацнення русіфікацыі на ўсёй велізарнай тэрыторыі, прычым не толькі беларускай, прыдбанай Расіяй у канцы XVIII — пачатку XIX ст. У чыне кормчага такой палітыкі на Беларусі добра праславіў сябе ўраджэнец Санкт-Пецярбурга Міхаіл Мураўёў. Стаўшы ў 1863 г. віленскім генерал-губернатарам з надзвычайнымі паўнамоцтвамі, ён у першую чаргу пастараўся ўвесці ў штат Віленскай вучэбнай акругі памочніка яе папячыцеля, абавязаўшы яго пільна сачыць за ходам ажыццяўлення русіфікатарскай палітыкі. На гэты раз яе прыхільнікі і праваднікі вялі барацьбу не толькі з польскім уплывам, але і беларушчынай, наўхільна прытрымліваючыся такой варожай для яе метадалагічнай устаноўкі М. Мураўёва: «У Паўночна-Заходнім краі так званую беларускую мову неабходна звесці на нішто, бо калі гэта не зрабіць, яна пастаянна будзе інспіраваць думку аб асобным беларускім народзе і аб праве гэтага народа на этнічную самастойнасць і нацыянальна-дзяржаўную суверэннасць, чаго дапусціць нельга».

Леанід Лыч падкрэслівае, што будучы «Вешальнік» яшчэ ў 1827 годзе, калі ён знаходзіўся на пасадзе Віцебскага генерал-губернатара, зразумеў, што насельніцтва былой гістарычнай Літвы шмат у чым адрозніваецца ад рускіх, і перш за ўсё ў мове. Безумоўна, турбаваў яго і «польскі фактар», які існаваў яшчэ з часоў І Рэчы Паспалітай. Тады ў М. Мураўёва і выспела разуменне, што змяніць сітуацыю на карысць Расійскай імперыі ў гэтым рэгіёне можна толькі з дапамогай рускай адукацыі. Польскі гісторык Хенрык Масціцкі ў адной са сваіх манаграфій прааналізаваў карэспандэнцыю віленскага генерал-губернатара і прыйшоў да высновы, што русіфікацыя і паменшэнне колькасці «небяспечнага польскага элементу» ў Паўночна-Заходнім краі Расійскай імперыі сталі галоўнай задачай расійскай адміністрацыі на чале з М. Мураўёвым у «заходніх губернях». «Вешальнік» закідваў сталіцу імперыі дэпешамі з патрабаваннем хутчэй абвясціць беларускі край «рускім» і ўвесці там т. зв. «рускую народнасць». М. Мураўёў пільна сачыў за тым, каб у справаводстве на тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў выкарыстоўвалася выключна руская мова. Да таго ж ён патрабаваў ад сваіх падначаленых, каб яны распаўсюджвалі інфармацыю пра тое, што «Паўночна-Заходні край заўсёды быў краем «рускім». Дарэчы, гэтыя захады нагадваюць тое, што зараз робяць адэпты заходнерусізму ў Беларусі.

Тыя, хто прыйшоў пасля «Вешальніка», працягвалі русіфікатарскую палітыку. Напрыклад, папячыцель Віленскай навучальнай акругі І. Карнілаў зрабіў усё, каб сваю фразу пра тое, што «канчаткова ўз'яднане Паўночна-Заходняга краю з Расіяй трэба здзейсніць не рускай зброяй, але рускай цывілізуючай сілай», пад якой, безумоўна, разумелася руская сістэма адукацыі, зрабіць рэчаіснасцю.

## Трагедыя паўстанцаў

Характарызуючы дзейнасць паўстанцаў Кастуся Каліноўскага на Беларусі, Гігін называе іх па сутнасці тэрарыстамі. Варта, аднак, разумець, што паўстанне 1863 года было сапраўднай лакальнай вайной, увагу на якую звярталі на Захадзе і чакалі, чым гэты нацыянальна-вызвольны ўздым скончыцца. Была жорсткасць з абодвух бакоў. Была кроў, але не трэба паказваць расійскую адміністрацыю беднай ахвярай «палякаў», як гэта спрабуе зрабіць рэдактар «Беларускай думкі». Царскі тэрор праявіўся не толькі ў павешанні 128 паўстанцаў, сярод якіх быў і беларускі герой Кастусь Каліноўскі. Ахвярамі сталі і многія тысячы жыхароў беларуска-літоўскіх губерняў, якіх царскія ўлады саслалі ў Сібір. І тая ссылка для шматлікіх жыхароў гістарычнай Літвы стала роўнай смяротнаму пакаранню. Царская адміністрацыя імкнулася пазбавіць беларуска-літоўскія губерні інтэлігенцыі і мясцовай шляхты. Усіх каталікоў яна імкнулася запісаць у «палякаў».

Усяго за ўдзел у паўстанні на ўскраіны імперыі было саслана на катаргу ці на пасяленне больш за 10 тысяч жыхароў гістарычнай Літвы. Гэта былі лепшыя з лепшых. Так імперыя спрабавала паставіць апошнюю кропку ў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і І Рэчы Паспалітай. Маёнткі дваран, якія ўдзельнічалі ў паўстанні, канфіскоўвалі і прадавалі выхадцам з цэнтральных расійскіх губерняў па сімвалічных коштах. Землеўладальнікам-каталікам забаранялася купляць і арандаваць зямельную маёмасць у краі, а для сялян-каталікоў уводзілася абмежаванне ў 60 дзесяцін на гаспадарку. У 1864 годзе зноў аднавіўся «разбор» шляхты — патрабаванне дакументальна пацвердзіць сваё шляхецтва.

Польскі гісторык Я. Качкоўскі падкрэсліваў, што царская адміністрацыя яшчэ доўгі час пасля падаўлення паўстання працягвала праводзіць такую палітыку ў Беларусі і Літве. «У свой час Кацярына і Мікалай працягвалі рукі, запэцканыя крывёй, да тых маёнткаў. А потым Аляксандры II і III высялялі землеўладальнікаў, каб на льготных умовах аддаць землі расійскім стаўленікам», — пісаў даследчык. Я. Качкоўскі згадваў, што ў перыяд з 1863 па 1905 год было канфіскавана 662 маёнткі. На яго думку, барацьба з т. зв. «польскасцю» на тэрыторыі Беларусі аказала вельмі негатыўны ўплыў на сацыяльна-эканамічнае жыццё краіны. І з гэтым цяжка не пагадзіцца, бо галоўнай мэтай падаўлення паўстання 1863 года быў не клопат пра беларусаў і іх будучыню, а звычайная інкарпарацыя тэрыторый былога Вялікага Княства Літоўскага ў склад Расійскай імперыі. А «крамолай» у вачах расійскай адміністрацыі аказалася не толькі «польскасць», але і беларускасць.



Кастусь Каліноўскі перад паўстанцамі. Мастак П.Сергіевіч

***

Пазіцыю Гігіна і яго аднадумцаў можна ахарактарызаваць вельмі проста — збаўленнем ад беларускасці. Галоўнай задачай сённяшніх адэптаў заходнерусізму ў Беларусі з'яўляецца барацьба супраць нацыянальнай памяці і гістарычнага мінулага беларусаў. Усе нацыянальныя матывы беларускай гісторыі для іх з'яўляюцца або «буржуазным нацыяналізмам», або «польскай інтрыгай». У гэтым яны, шмат у чым паўтараюць сваіх царскіх і савецкіх паплечнікаў-русіфікатараў. А для Беларусі паўстанне Кастуся Каліноўскага назаўсёды застанецца лёсавызначальнай падзеяй, што аказала ўплыў на фармаванне нацыянальнай свядомасці беларускага народа. Так было і так будзе.

УСПАМІНЫ

# СВАЁЮ ПУЦЯВІНАЙ

Арсень ЛІС

**Працяг.**
**Пачатак у №№ 3, 4**

**Да вясны я перабраўся ў новую кватэру. Параіла мне яе наш раяноўскі справавод пані Лідзія, сталая жанчына з тутэйшых местачковых жыхароў. Дом маіх новых гаспадароў стаяў воддаль ад вуліцы, у зацішшы ад яе руху-тлуму, няхай сабе той тлум быў і невялікі, местачковы.**

Гаспадар, чалавек спакойны, разважлівы і, як я неўзабаве ўпэўніўся, мастраваты, дзесь самастойна, не ведаю, як яму тое ўдавалася, сталяраваў, выязджаў на заробкі. Гаспадыня, заўсёды рухавая, увішная, згадзілася сталаваць пастаяльца. Толькі я мусіў быў сам закупляць на рынку прадукты, куры, рыбу, а рэшта, што хочаш, што сабе да густу.

Мне быў адведзены пакойчык гаспадарскага сына, які на той час служыў у войску. Вокны майго пакоя выходзілі на поўдзень. Яны глядзелі на невялікі і ўжо немалады сад. Вечарамі я дачытваў яшчэ ва ўніверсітэце запланаванае. Пасля мемуараў «Былое и думы» Герцэна, якія ўразілі, захацелася паўней прачытаць Дабралюбава. Заімпанавала, як ён адзін у 60-я гады XIX стагоддзя, у часы дурнога цкавання ў правай рускай прэсе ўсяго беларускага, самога імя беларуса, катэгарычна запярэчыў: «Не ведаем, у якой ступені лжывы такі погляд, бо не вывучалі спецыяльна беларускага краю. Але паверыць яму, разумеецца, не можам. Цэлы край так вось узялі ды і забілі — штосьці не так! Гэта тое ж, што італьянцаў забілі, расслабілі, пазбавілі любові да Радзімы і свабоды!.. Паглядзіце цяпер на іх. Ва ўсякім выпадку пытанне аб характарыстыцы беларусаў павінна быць хутка высветлена працай мясцовых пісьменнікаў. Паглядзім, што яшчэ скажуць самі беларусы». І яшчэ помнілася пра яго Някрасаўскае:

*Природа-мать, когда б таких*
*людей*
*Ты иногда не посылала миру,*
*Заглохла б нива жизни…*

У перамешку з творамі рэвалюцыйных дэмакратаў пазнаваўча ўнікаў вечарамі ў міні-манаграфіі пра мастакоў і кампазітараў: Рэмбранта, Рэпіна, Глінку, Шуберта, Ліста. Пры гэтым ажывала бачанае і праслуханае. Калі Феранц Ліст «Венгерской рапсодыяй» неяк паволі ўводзіў у чарадзейства гукаў і мелодый, выклікаў перажыванне-роздум, то Шуберт будзіў сонечны, узнёслы настрой з першых акордаў, першых строф сваіх рамансаў.

Калі-нікалі нейкія смутныя перажыванні, малады настрой выказваліся, натаваліся вершам:

*Пралесак, сонечных праменяў,*
*Удыхаць вільготны дух лясны,*
*Вады з ракі зачэрпнуць жменяй,*
*Трывожным нечым летуцець,*
*Далёкім шляхам утаміцца,*
*На стромую рачной запець,*
*У абдымках нечых ачуціцца.*

*А потым зноў да працы той,*
*Якой і дні і парыванні...*
*І для Яе, яе адной*
*Жыць да апошняга дыхання.*

«Яна», «яе» — гэта, канешне, увасабленне. Можна падумаць, што занадта гучна заяўлена пад імем-займеннем радзіма-Беларусь. Але так было, так адчуваў з юначых гадоў.

Цяпер мушу ўспомніць, вярнуцца ў часе назад, каб нешта высветліць, растлумачыць, можа, перш-наперш сабе. Аналітыкамі ў сямнаццаць год не становяцца. Гэта інтэлектуальны прывілей старэйшага ўзросту. Ёсць падумка, што да сталай аналітыкі мужчына дарастае ў сорак. Але што да ўласнай асобы, мушу сказаць, прынамсі ў грамадскіх рэаліях жыцця, патрапіў разабрацца досыць рана. Не тое, што асэнсаваў сістэму, у якой жылі, але нечага істотнага ў ёй не стаў прымаць — няпраўду, фальш.

Не сказаць, каб дома, ад бацькоў, даводзілася чуць нешта рэзка крытычнае ў дачыненні да ўлады. Хіба нейкія прынагодныя факты непрымання. Здаецца, бацька і маці, якія перажылі некалькі зменаў улады, успрымалі іх спакойна, можа, як наканаванасць. Праўда, ад дзядзькоў па матчынай лініі, дзядзькі Грышкі-Рыгора, якому пры паляках не ўдалося абмінуць Лукішскай турмы, і дзядзькі Захаркі часам здаралася пачуць размовы пра палітыку, цякучую або нешта з яе мінулага. Дзядзькі любілі папалітыкаваць, як расцэньвала тыя іх гутаркі маці.

Не ўсіх матчыных братоў, сваіх дзядзькоў, давялося ўбачыць мне пры жыцці.

Найстарэйшы, Якуб, у акопах Першай сусветнай вайны стаў бальшавіком, а ў 1918-м — адным з арганізатараў саўдэпа ў Ашмянскім павеце, да якога належала тады і наша Смаргоншчына. Загінуў на польска-савецкім фронце недзе пад Докшыцамі.

Падстаршы, Іван, не ведаю, якую меў адукацыю. Маці ўспаміняла, што ў 1919-м у савецкай на той час Вільні быў начальнікам пошты. На адным з мітынгаў у яго стралялі. Жыццёвую і службовую кар'еру закончыў у Мінску работнікам ГПУ. Як выхадзец з Заходняй Беларусі не перажыў рэпрэсіўнага 1937 года.

Трэці, Васіль, выпускнік Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі, у 1924 годзе скончыў разведшколу ў Маскве. Быў накіраваны сакратаром вайсковага аташэ пры савецкім пасольстве ў Іране, пазней стаў контрразведчыкам у Чырвонай Арміі. У 1938-м, аднак, не пазбег арышту, Лубянкі, высылкі на Усход. Але ўдалося выжыць, і ў 70-я гады, праз паўвека, прыехаў з Хабараўска адведаць малую радзіму, Яневічы. Чацвёрты старэйшы мамін брат, дзядзька Грышка, адзін з пяці Юстынавых сыноў, які ўсе свае 90 год заставаўся на гаспадарцы пры бацьку земляробам, потым калгаснікам. Вялікай навукі не асягнуў. Скончыў адно царкоўна-прыхадское вучылішча ў суседніх Міхневічах. Рухавы з натуры, меў, сказаў бы, фенаменальную памяць. Мне запомніўся сваімі частымі дэкламацыямі беларускіх вершаў. Чытаў артыстычна, з усмешкай, акцэнтацыяй асобных выразаў, мясцін з іх. Уражвала неяк асязальна вершаванае слова з яго вуснаў.


Арсень Ліс з Іванам Цішчанкам, Алесем Яскевічам, Алесем Адамовічам, Міколам Прашковічам


Шаркоўшчына, водны млын. Здымак сярэдзіны 1950-х гадоў

*Перастануць нашым братам,*
*Як скаціна́й таргаваць, —*
*Напускацца ліхім матам,*
*Скуру з ног да карку драць.*
*Будзем роўнымі з панамі,*
*Самі будзем мы паны —*
*І гарэлку піць збанамі,*
*І гуляць так, як яны.*
*Хоць халадна, хоць галодна,*
*Холад, голад ніпачом!*
*Эх, каб толькі нам свабода!*
*На свабодзе аджывём.*
*Мужык будзе не скаціна́й;*
*Не раз скажа пан з паноў:*
*«Пане Грышка, пане Міна!*
*Як жа васпан? Ці здароў?»*

Некаторыя з пачутых ад дзядзькі Грышкі вершы запомніліся мне з дашкольных гадоў. Запаміналіся не ад таго, што я малым мог ацаніць іх, а, мусіць, сваім жывым вобразным словам, панятлівай мовай. Вось як гэты Багушэвічаў верш:

*Не цурайся мяне, панічок,*
*Што далонь пакрываюць мазолі;*
*Мазоль — працавіты значок,*
*Не заразіць цябе ён ніколі.*
*То медаль за труды і за муку...*

Чамусьці мяне, падрослага, асабліва ўражвалі словы заключныя:

*Каб умеў кіраваць я пяром, —*
*Я бы ксёнжку счыркаў, як папар,*
*Усё аб тым, як мы сеем, аром,*
*І як косім і жнём божы дар.*
*Можа б ты прачытаў той грымзол*
*І да працы набраўся ахвоты,*
*Шанаваў бы мужыцкі мазоль,*
*Не цураўся б мужыцкай бядоты,*
*І падаў бы руку мне, сляпому,*
*І давёў бы мяне да дарогі;*
*Не блудзіў бы і я сярод лому*
*І калючак, што раняць мне ногі!*

Неяк інакш гучалі дэкламаваныя дзядзькам Грышкам вершаслоўы:

*Хто сказаў: «і я з народам»,*
*Хто з ім поплеч стаў, як з братам,*
*Хто пайшоў з ім роўным ходам*
*К роўным зыскам, роўным*
*стратам, —*
*З тым і я. Няхай жа ліча*
*Будзе трэба — хай пакліча...*

Энергічныя радкі гэтыя не сустракаліся ў падручніках па літаратуры ні ў школьныя гады, ні за ўніверсітэцкім часам. А належалі яны Алесю Гаруну, паэту, рэвалюцыянеру, сасланаму царызмам яшчэ маладым хлопцам у Нарымскі край, а з ліхіх 30-х забароненым у сябе на бацькаўшчыне.

Як пазней зразумеў я, начытанасць беларускага, веданне літаратурнай беларушчыны ў майго дзядзькі ішлі ад грамадска актыўных у Заходняй Беларусі 1920-х гадоў. На той час яшчэ нежанаты, быў ён сакратаром гуртка БСРГ у сваіх Яневічах, чытаў вечарамі маладзі беларускія газеты, што ішлі тады часта-густа з Вільні ў заходнебеларускія вёскі, мястэчкі.

Усмешлівы, іранічны дзядзька Грышка прынагодна мог успомніць яшчэ цара Мікалая. Маўляў, «як быў цар-дурачок, дык быў фунт хлеба пятачок», а «як сталі Ленін і Троцкі, дык не хапіла мукі на клёцкі». Мог прадставіць палітыку правадыроў у асобах і іх дзеянні. Навочна паказаць палітыку Леніна часоў НЭПа. Ленін, маўляў, у бацінках, то калі на дарозе траплялася лужына, абмінаў, абходзіў яе. Сталін жа, паколькі ў ботах, то крочыў напрасткі.

Дзядзька Захарка мераў кожную ўладу па яе адносінах да селяніна-земляроба. Два старэйшыя браты яго былі ў свеце. Самы старшы, скончыўшы гарадское вучылішча, перад Першай сусветнай вайной з'ехаў у Амерыку, а серадольшы, закончыўшы Віленскую беларускую гімназію, сышоў у Саветы з надзеяй атрымаць мастацкую адукацыю. На жаль, сягоння болей не спытаеш — усе адышлі ў вечнасць.

У пакалення заходніх беларусаў пачатку XX стагоддзя быў свой гістарычны лёс і свой жыццёвы досвед. Яго прадстаўнікі ў


Арсень Ліс. 1950-я гады

масе сваёй ужо мелі пасільную адукацыю, прарываліся да асветы на роднай мове, што непасрэдна будзіла цікавасць да культуры і гісторыі свайго народа, спрыяла заангажаванасці ў яго сацыяльных і нацыянальных праблемах.

Палякі, якім па Рыжскай дамове з Саветамі адышлі землі Заходняй Беларусі, імкненне беларусаў да свайго роднага, да самаідэнтыфікацыі адразу пастараліся спыніць дзеля сваіх мэтаў.

Ужо ў першы прыход вясной 1919 года легіёнаў Пілсудскага ў Беларусь вайсковай адміністрацыяй была закрытая Беларуская гімназія ў Будславе, забаронена выданне ў Вільні газеты «Беларуская думка».

Пасля ўсталявання польска-савецкай граніцы, за непрацяглы час існавання так званай Сярэдняй Літвы, тагачасным супрацоўнікам яе асветнага дэпартамента Браніславу Тарашкевічу і Янку Станкевічу з апорай на мясцовую інтэлігенцыю ўдалося арганізаваць беларускія настаўніцкія курсы ды адкрыць на Віленшчыне каля двухсот беларускіх, пераважна пачатковых школ. Адкрыццё іх звычайна адбывалася з ініцыятывы настаўнікаў, на падставе прынятага рашэння на сходзе вясковай грамады. У вяскоўцаў пры гэтым выразна праяўлялася жаданне даць дзецям грамату, здабыць асвету, было ўсведамленне важнасці яе жыццёвага значэння.

Адна з такіх школ адкрылася ў нашым Вётхаве. Арганізаваў яе выпускнік Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі, які скончыў у Вільні беларусазнаўчыя курсы, Янка Дудка, наш сусед. Школка размясцілася ў нашай дзедавай хаце, і мае будучыя бацькі спазналі ў ёй пачаткі беларускай граматы.

Лёс вётхаўскай школкі, на жаль, аказаўся кароткім. Польская паліцыя арыштавала настаўніка-арганізатара яе пасля таго, як нехта раскідаў на аселіцы камуністычныя афішкі. Ніякага дачынення Ян Дудка да тых афішак, вядома, не меў, але ж настаўнік, да таго яшчэ беларускі... Палітычная паліцыя, не турбуючы сябе дазнаннямі, адправіла маладога асветніка на некалькі месяцаў у Лукішскую турму, і школка распалася. Маці ўспамінала, што нейкі час задавала сама сабе хатнія заданні, і здымала іх, балазе дома былі кнігі старэйшага брата Васіля, выпускніка Маладзечанскай семінарыі, які ў 1920 годзе нелегальна падаўся праз граніцу на Усход. На тым навучанне маці і закончылася. Бацька яшчэ некалькі павучыўся ў школе з польскай мовай навучання, у якой былі ўрокі і па-беларуску. Зноў жа, да арышту настаўніка-беларусазнаўца Язэпа Гаўрыліка, што пазней быў выбраны ад заходніх беларусаў у сойм II Рэчы Паспалітай, а потым загінуў у СССР. Бацька ўсё спадзяваўся, што ён недзе яшчэ жыве...

Заканчэнне ў наступным нумары

ПРЭМІЯ

# КРОК ДА БЕЛАРУСКАСЦІ — ДАЛЕЙ АД «БУЛЬБАШОЎСТВА»

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**Нядаўна мы сталі сведкамі заснавання яшчэ адной музычнай прэміі, на гэты раз ад «Еўрарадыё» «Даём рады», падвядзенне вынікаў якой адбылося ў клубе «RE: PUBLIC».**



Андрусь Такінданг з прызам для гурта «Гартніца»

Пасля таго, як «Рок-каранацыю» з розных прычын напаткаў крызіс, і лёс галоўнай выніковай рок-імпрэзы застаецца няўзначаным, на айчыннай фестывальнай сцэне ўзнікае ўсё больш музычных прэмій, заснавальнікі якіх па-свойму падводзяць вынікі года і ўзнагароджваюць лепшыя беларускія каманды. Як гэта зрабілі, напрыклад, інтэрнэт-парталы «Тузін гітоў» і «Ультра-мюзік».

І вось яшчэ адна ініцыятыва. Трэба адзначыць, што арганізатары гэтай музычнай прэміі — журналісты «Еўрарадыё» не хавалі таго факту, што экспертамі ў адборы лепшых выканаўцаў і твораў беларускай рок-музыкі выступілі яны самі. Тым больш было цікава параўнаць свой асабісты шорт-ліст з прыхільнасцямі радыёстанцыі — адной з нешматлікіх, на хвалях якой прапісаўся беларускі рок ва ўсіх яго стылістычных і моўных праявах.

## Дэбют года і лепшы кліп

Першым на сцэну выніковага канцэрта быў запрошаны гурт, які, на думку радыё-журналістаў, перамог у намінацыі «Дэбют года» — «Clover Club». Калектыў малады і, безумоўна, прафесійны. Па рэакцыі слухачоў можна было зразумець, што песні «Clover Club» былі ім знаёмыя. Выкажу сваю здагадку — знаёмыя з інтэрнэту.

Але і на сцэне маладыя музыканты пачувалі сябе ўпэўнена. Адна толькі праблема: удзельнікі гурту губляюць час і талент на тое, каб з дапамогай недасканалай англійскай мовы і арыентацыі на модныя напрацоўкі заходніх выканаўцаў заняць месца ў сусветных чартах лідараў індырока. Ці магчыма такое ў акіяне сусветнага шоў-бізу? Тэарэтычна, так. Але без вядомасці ў сябе на радзіме, без музычнай аўтэнтычнасці гэтыя шанцы мінімальныя. Так што дэбют «Clover Club» атрымаўся заўважны, але з вялікім пытальнікам наконт далейшай перспектывы гурту.

Лепшым кліпам, на думку журналістаў, стала музычная стужка гурту «VEGETABLES» «Baloo», у якой, як у люстэрку, адбіліся праблемы візуалізацыі музыкі большасці гуртоў з Беларусі, у творах якіх часцяком цяжка знайсці ці адчуць тое, дзеля чаго музыканты выходзяць на сцэну, у чым звышзадача іх творчага пасылу.

## Паралельныя ўзнагароды

Але не толькі калектыў «Еўрарадыё» адзначаў у гэты дзень лепшых. Знайшлося месца для ўзнагарод беларускіх выканаўцаў ад імя мясцовых і замежных музычных структур. Напрыклад, вядомы беларускі рок-музыкант і прадзюсер Алег Ціханаў, які цяпер прадстаўляе ўкраінскі тэлеканал «культурнага супрацву» A-ONE, узнагародзіў беларускія гурты «Clover Club», «Yellow Brick Road» і «Akute» адмысловымі сертыфікатамі на ратацыю іх музычнага відэа, калі тыя здымуць кліпы на свае песні. А студыя гуказапісу «OSMOS» адзначыла гурт «Гаротніца» сертыфікатам на запіс сінглу. Застаецца падзякаваць прадстаўнікам гэтых музычных кампаній за ўвагу да беларускай рок-музыкі і жаданне зрабіць для нашых выканаўцаў нешта вартае.

## Надзея года

Ужо стала звычным, што творчасць гурту «Re1ikt» знаходзіць усё больш прыхільнікаў сярод маладых аматараў айчыннага цяжкага року. Прычына ў іх уменні сродкамі рок-музыкі данесці да слухачоў усе нюансы паэтычных радкоў кампазіцый. Да таго ж, іх магутны, празрысты гітарны гук прымушае засяроджвацца толькі на іх музыцы і мелодыцы.

Так адбылося і на гэтым канцэрце, дзе музыканты выканалі некалькі кампазіцый з апошняга альбому «Рэкі прабілі лёд». Высокі прафесіяналізм і небанальны кампазіцыйны талент удзельнікаў гурту «Re1ikt» ужо вывеў іх у лідары айчыннай рок-музыкі. Вынікі мінулага года пацвердзілі гэтую тэндэнцыю, як і тое, што ад гурту чакаюць штурму новых творчых дасягненняў. Мо таму арганізатары прэміі «Даём рады» адзначылі гурт «Re1ikt» прызам «Надзея 2013 года», маючы на ўвазе іх патэнцыял заставацца сапраўдным лідарам рок-сцэны ў бягучым годзе.



Гурт «Clover Club»

## Сінгл года

Намінацыю «Сінгл года» арганізатары аддалі гурту «AVIAS», які сваёй кампазіцыяй «Смецце» штурмаваў не толькі інтэрнэтпрастору, але і цягам мінулага года пастаянна выконваў песню на клубных пляцоўках. Сінгл «Смецце» — даволі запамінальная кампазіцыя ў стылістыцы post-grunge. Трэба адзначыць, што гурт «AVIAS» — калектыў, які скарыстаў у сваёй творчасці вопыт папярэдняга творчага праекта — гурту «Крок» і цяпер выкарыстоўвае ў сваіх аранжыроўках шмат з індзі-, поп- і альтэрнатыўнага року.

Сярод нечаканасцяў выступлення гурту «AVIAS» адзначу натхнёную і прафесійную ігру выканаўцы на ўдарных Vicky Fatez, чыя тэхнічная, «недзявочая» манера прыцягвала ўсеагульную ўвагу і авацыі тых, хто ў гэты дзень слухаў музыку гурту «AVIAS».

## Жыве рок-н-рол

Сярод тых, каму ў гэты дзень не дасталася выніковага «слана», але каго з гонарам запрасілі на сцэну, стаў бярозаўскі гурт «:B:N:». Такі быў прадуманы ход арганізатараў прэміі «Даём рады».

Яны ведалі, што музыка «:B:N:» выкліча ў слухачоў такі энтузіязм і эмацыянальнае ўзрушэнне, дзеля якога ўласна і праводзяцца рок-канцэрты. Адзін за адным разам з залай спяваліся хіты «:B:N:» «Крок за крокам», «Загінулым паэтам прысвячаецца», «Цягнік», «Канюшня». Але лейтматывам сэту «:B:N:» стала праграмная кампазіцыя «Жыве рок-н-рол», словы і рытмы якой давалі столькі пазітыўнай энергетыкі, што яе хапіла і на іншых гасцей выніковага канцэрта.

## Гурт–2012

Эстафету лідараў сярэдняй генерацыі айчыннай рок-сцэны неўзабаве пераняалі магілёўцы з гурту «Akute», музыканты якога былі адзначаны ў намінацыі «Гурт 2012 года» (разам з панк-камандай «Дай Дарогу!» з Брэста) і ў намінацыі «Альбом 2012 года» (разам з альбомамі «Futuremental» ад гурту «Yellow Brick Road» і «Сквозь г...но» ад памянёных берасцейцаў «Дай Дарогу!»). Нягледзячы на тое, што «Akute» гэтым разам засяроджвалася на выказванні глыбінных пачуццяў, выконвалі старыя хіты («Іголкі», «Адзінотва» і інш.), слухачы вельмі актыўна сустракалі сваіх куміраў, бо знаходзілі ў музыцы любімага гурту роднасныя эмоцыі, праз што і ствaралася святочна-ўзнёслая канцэртная атмасфера.

Нягледзячы на тое, што панкгурт «Дай Дарогу!» быў заяўлены хэдлайнерам гэтага канцэрта, а ў клубе «RE: PUBLIC» сабралася нямала прыхільнікаў панк-року, на долю берасцейцаў выпала выкананне нежартоўнай задачы: падтрымаць той эмацыянальны напал канцэрта, які быў створаны іх беларускамоўнымі папярэднікамі.

## Шалёны канцэрт

Арганізатары прэміі «Еўрарадыё» «Даём рады» ўручылі гэтай камандзе аж тры намінацыі — «Лепшы гурт 2012 года» (разам з «Akute»), «Лепшы альбом 2012 года» (разам з «Akute» і «Yellow Brick Road»), музыкі таксама атрымалі прыз клуба «RE: PUBLIC» «За самы шалёны канцэрт». Таму музыканты гурту «Дай Дарогу!» выйшлі на сцэну і адыгралі свой сэт у добрым гуморы. Захапляла іх сакавітае, падобнае на шквал, прафесійна выверанае гучанне. Хоць тэксты іх песень былі падобныя на прыпеўкі (часам аздобленыя моцнымі слоўцамі, якіх няма ў слоўніку Даля), яны закранaлі вострыя сацыяльныя праблемы, традыцыйныя для рускага панк-року: п'янства, сацыяльныя праблемы і неўладкаванасць, маргіналізацыя некаторых пластоў грамадства...

Што тычыцца нацыянальных рысаў у творчасці гурту «Дай Дарогу!», якая сёння так актуальная для ўсёй беларускай рок-сцэны, то берасцейскія госці ўсім сваім выглядам дэманстравалі сваю пазіцыю: «До лампачоки нам ваши белорусские дела. Мы ж не националисты!» Як кажуць дасведчаныя, гэта і ёсць «рок з Беларусі»...

## Вынікі

Але нягледзячы на тое, што на ўручэнні музычнай прэміі паводле «Еўрарадыё» былі сабраныя такія розныя гурты і іх прыхільнікі, яна, безумоўна, мела свае станоўчыя вынікі. Па-першае, слухачы атрымалі ўрок разумення таго, што ўсе мы — беларусы, незалежна да якога музычнага напрамку маем піетэт. Па-другое, у беларускім рок-руху спее разуменне неабходнасці стаць у шыхт абаронцаў роднай мовы і нашай нацыянальнай тоеснасці, узняць голас супраць «бульбашоўства», якое нам навязваецца замест нацыянальнага ў айчыннай культуры. У гэтым бачыцца місія такіх музычных святаў, у тым ліку і прэміі «Даём рады», ініцыяванай «Еўрарадыё».

Былі і іншыя намінацыі, у якіх перамаглі наступныя выканаўцы і праекты:

«Фестываль–2012» — «Пікнік. by»

«Не патанаючая легенда» — «Рок-каранацыя»

«Сольны выканаўца–2012» — Зміцер Вайцюшкевіч

Таксама прэміі «Еўрарадыё» ў жартоўнай намінацыі «Нестандартныя ракурсы» атрымалі Аляксандр Памідораў, гурты «Chiefs Band», «RetroElektro».

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК.** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас. 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл. (+375 17) 284 85 11.

**ВЫДАВЕЦ.** Прыватнае выдавецкае ўнітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА.**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл. +375 29 986 38 05, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет».
г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 154

Падпісана да друку 08.02.2013. 8.00.
Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

При выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.